Міністр у Беластоку ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Беларуская гісторыя... ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 44 (2790) Год LIV | Беласток, 1 лістапада 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Спаборніцтва ў галіне эмоцый

„Намалюй мне вясну", — спявае адзін з удзельнікаў фестывалю „Бардаўская восень" гурт „Босае сонца". Затое маляваць сёлетнюю восень узяўся Міхал Анемпадыстаў і намаляваў грушу. Такім салодкім і прывабным стаў шаснаццаты выпуск гэтага фестывалю. Тры дні, з 23 па 25 кастрычніка, эмацыянальна зараджалі слухачоў выступоўцы з Беларусі і Падляшша. Як глядач і, заадно, выканаўца пастараюся рассунуць шторы сёлетніх „Бардаў". Цяжкія, мяккія ды спакуслівыя.

— Ужо зараз не так шмат турбуюся за ўдачу, — яшчэ да фестывалю тлумачыў мне Міхал Сцепанюк, старшыня Звязу беларускай моладзі, арганізатара мерапрыемства. Ён не піянер, а фестываль мае ўжо добра распрацаваную сістэму арганізацыі.

— Не выспаны, — да мяшка пачуцяў дакінуў Ігар „Поўная галава думак" Лукашук, чалавек якога, здаецца, можна без сумнення назваць дырэктарам „Бардаў".

Няма як спаць у час фестывалю. Адзін раз у год здараецца магчымасць сустрэць на даўжэйшую хвіліну такіх кантэстатараў як графік і інтэлектуал Міхал Анемпадыстаў, ці такіх майстроў гуку як Аляксандр Шувалаў — баяніст і сябра Зміцера Вайцюшкевіча. Кампанія намнога большая, але ўжо добра вядомая. Толькі конкурснікі мусяць неяк хутка прыстасавацца да новых умоў: даверу і сяброўства.

— Я не вельмі хацеў выступаць у конкурсе, — прызнаўся адзін з удзельнікаў, — але не бачыў іншай магчымасці трапіць у Бельск-Падляшскі. Зразумела, можна быць толькі слухачом, але ўсё ж такі хочацца нешта сказаць публіцы. І проста тут пабыць.

„Быць". У гэтым слове заключаецца ідэя фестывалю. Трэба прысутнічаць, каб зразумець узровень эмоцый, каб зразумець сэнс слоў, якія плывуць са сцэны і, урэшце, каб адкрыць вартасць сустрэчы з другім чалавекам. А такіх сустрэч сёлета было намнога больш, чым звычайна.

— Шаснаццаты фестываль „Бардаўская восень" лічу адкрытым, — амаль машынальна сказаў Ігар Лукашук. Без эмоцый, думаеце? Зусім наадварот. Пасля шматлікіх гадоў Ігар рыхтаваўся да выступу перад публікай у поўнай таямніцы і проста з'ядала яго хваляванне. Пасля конкурснай часткі зачараваў усіх джазавай інтэрпрэтацыяй аднаго з беларускіх народных гімнаў — „Купалінкі".

— Мне вельмі ў Бельску спадабаўся ў гэты раз Зміцер Вайцюшкевіч, — сказала адна са слухачак. — Здаецца, дзякуючы ўдзелу ў кампаніі „Будзьма!", ён стаў больш спелым, такім адказным. І больш нацыяналістычным, больш беларускім заадно, — шчырай усмешкай дапоўніла сказ жанчына.

— Можа мерапрыемства ўжо не павінна называцца „Бардаўскай восенню", — сумняваўся затое адзін з удзельнікаў фестывалю. — Гэта так неадэкватна. Тут жа нават электрычныя гітары гучаць, бубны, а ў конкурсе побач сапраўдных бардаў змагаюцца цэлыя гурты.

Не трэба так турбавацца. „Бардаўская восень" гэта ўжо марка. Варта тое тлумачыць. Не пазбегнуць ужо зараз змен, тых натуральных, якія праходзяць у музыцы, у спосабе гледжання на яе, у спосабах прэзентацыі. Наадварот, арганізатары самі не баяцца ўводзіць змен, так у састаў удзельнікаў, які і ў праграму. Знянацку, думаю, схапіла ўсіх „старых сяброў" фестывалю, што ў Бельскім доме культуры толькі адзін раз сабралася публіка! Можа не быў гэта рэкорд колькасці гледачоў, але публіка праверана, цярпліва вытрымала амаль да 22 гадзіны. Толькі чамусьці бракавала гэтых усіх маладых твараў з беларускіх ліцэяў. Відаць, у нашых школах забываюць пра ДОБРЫЯ ТРАДЫЦЫІ.

„Relikt"

У суботу фестываль раз'ехаўся па рэгіёне. З бельскай ратушы, дзе перад усім моладзі прэзентавалася „Босае сонца", павандраваў у арлянскую сінагогу. Там упершыню падляшскай публіцы зайграў Юры Несцярэнка, самы вядомы беларускі блюзмен, а побач гукаў „Ilo&friends" з'явіліся таксама галасы мясцовых жыхароў. Вельмі інтэрактыўны быў сам войт Орлі, Пётр Сэльвесюк, які невыпадкова падкрэсліў, што ў Орлі зараз ёсць не толькі „Urząd Gminy", але таксама „Гмінная ўправа" і „Нэма чого встыдатісь". У Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы стварылася на гэты раз зона паэзіі. „Анархічная Надзя", як сама акрэсліла сябе бельская паэтэса Надзея Артымовіч, чытала свае вершы. Выдатна, як звычайна. Задуменным голасам яе тэксты спяваў пад гітару Алег Кабзар. Нічога тут дадаваць больш не трэба. Можа толькі тое, што з'явіцца ў будучыні супольны альбом гэтых творцаў. На Гайнаўшчыне, а дакладна ў Тэрэміскаx, чараваў публіку Віктар Шалкевіч. Віця, хаця акцёр, спявак, бард, „высокая" пэрсона — свой чалавек, і такое ўражанне пакінуў пасля свайго канцэрта. Не да канца задаволены ў гэты дзень быў толькі Лявон Вольскі, які зайграў у Гарадку. Хаця выступу не мусіць саромецца, то з-за рамонту дома культуры канцэртныя ўмовы завялі ў піцэрыю „Хадэс", якую частка гарадоцкіх пяшчотна называе „Сэдэсам".

У фестывальную нядзелю смакавітыя выступы чакалі беластоцкую публіку. Фінал у кінатэатры „Форум", дзе апрача лаўрэатаў новы рэпертуар праспяваў пад акампанемент фартэпіяна Віктар Шалкевіч, „Босае сонца" вадзіла за нос усе пакаленні слухачоў, а акустычны канцэрт „Н.Р.М.", як і ў мінулы раз, пахвальна пройдзе ў гісторыю — так як і выступ лаўрэата Гран-пры гурту „Relikt". Хіба ўсе згодны ў справе таленту каманды з Гомеля. Пазіцыю журы з гонарам абаранялі таксама вылучаныя Кацярына Ваданосава ды Міхал Бараноўскі.

Варта адзначыць, што чарговы год шматгадзінны канцэрт у Бельску-Падляшскім і фінальны ў Беластоку непасрэдна ў жывым эфіры транслявала Беларускае Радыё Рацыя.

Калі апошнія гукі гітары Лявона Вольскага прагучалі ў Студыі „Рэмбрант" Радыё Беласток, завершыўся і цэлы фэстываль. Шкада, як заўсёды. І як заўсёды будзем чакаць наступнай восені.

XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група**: дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група**: астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, набраныя на камп'ютары або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

7. Працы надасланыя аўтарамі ў мінулым годзе пераходзяць у сёлетні конкурс

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **12 лістапада 2009 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2009 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Конкурс праводзіцца дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!!!

9 770546 196000

За і Контра

Здаецца, што час, калі ўсе незалежныя аналітыкі і палітычныя аглядальнікі спрэс пісалі, што рэжым Аляксандра Лукашэнкі трымаецца выключна на расійскай фінансавай і сыравінна-паліўнай падтрымцы, мінае. У знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь выразна акрэсліўся так званы заходні вектар. У сэнсе не мы да іх прыхільна нашым дзяржаўным курсам, а яны да нас сваімі інвестыцыямі. Атрымліваецца, што Беларусь становіцца ўсё больш прыцягальнай у эканамічным сэнсе для цэлага шэрагу звышдзяржаўных структур. Такіх, прыкладам, як Міжнародны валютны фонд. Рада дырэктараў гэтай арганізацыі, асноўнага на сёння донара беларускай эканомікі, прыняла пастанову пра выдаткаванне для беларускай эканомікі чарговых 700 мільёнаў долараў крэдыту на „стабільнасць" і ў залік праведзеных урадам рэформ. Якія добрыя дзядзькі сядзяць у гэтым МВФ! Так ужо хочуць памагчы беларускай эканоміцы. Толькі нешта не верыцца ў такое некарыслівае дабрадзейства. У гэткую старую казачку „Ленін думае пра Беларусь" на новы, на гэты раз заходні лад. Лішне казаць, што структурнымі рэформамі ў гаспадарцы Рэспублікі Беларусь і не пахне. А ёсць жа яшчэ і аспекты дэмакратызацыі беларускага грамадства, нібыта ўмовы, якія выстаўляе той жа Еўрасаюз кіраўніцтву Рэспублікі Беларусь. Выяўляецца, што ўсё гэта толькі словы і тыя сама славутыя падвойныя стандарты. Калі справа ідзе пра грошы, маральныя катэгорыі ў разлікі не ўваходзяць. Ніхто нават не ўзважвае нейкія „pro" і „contra". Што там некалькі дзесяткаў збітых за праўду людзей. Ды не збяднее рука даючага! Толькі хто будзе аддаваць гэтыя крэдыты, якія лічацца ўжо на мільярды?

Аляксандр Лукашэнка разам са сваім урадам вельмі ўдала і проста карыстаецца „гнуткай" пазіцыяй захаду. Хочаце дэмакратызацыі — ну зарэгіструем адну-дзве недзяржаўныя арганізацыі, затое прымусім закрыцца пяць, а яшчэ дваццаць не зарэгіструем. Хочаце вольнасці ў грамадстве — не будзем садзіць іншадумцаў на 10-15 сутак адміністрацыйнага арышту, проста дубінкамі іх на плошчы прылашчым, ажно да крыві. Хочаце змены выбарчага заканадаўства, зробім касметычныя папраўкі ў выбарчы кодэкс — вось, бачыце, як пайшоў працэс лібералізацыі. З рэформамі гаспадаркі яшчэ прасцей. Хочаце структурных змен эканомікі — будзем гаварыць, што яны адбываюцца. Усё і так праглынуць, вышлюць адмысловую камісію, якая пацвердзіць, што станоўчыя зрухі адбываюцца, выступіць які-небудзь эксперт-мудрагель. І паехалі далей. Alle zusammen за Беларусь!

Але ёсць яшчэ, нават сярод палітыкаў і дыпламатаў, людзі здольныя гаварыць праўду (здавалася б, гэтакая простая і натуральная рэч для вольных людзей!). Такія, як надзвычайны і паўнамоцны пасол Венрыі ў Рэспубліцы Беларусь Ферэнц Контра. Ён не пабаяўся выказацца наконт парадкаў у нашай краіне з правамі чалавека і сапраўднай гаспадарчай сітуацыяй. Амбасадар наўпрост заявіў, што ў Беларусі збіваюць мірных дэманстрантаў, а журналістам не даюць выконваць іх прафесійных абавязкаў. Характэрна, што міністэрства замежных спраў беларускай дзяржавы адразу адрэагавала на гэтыя выказванні, назваўшы іх „тэндэнцыйнымі і недружалюбнымі". Думаецца, што МУС закранула не столькі гэтая фраза, а словы дыпламата пра тое, што „ровень даверу паміж Беларуссю і Еўрасаюзам — недастатковы". Вось чаго насамрэч і найбольш баяцца сённяшнія ўлады. Але Контра пацвердзіў сваю пазіцыю, сказаўшы, што не можа называць шэрае белым і заўсёды гаворыць тое, што думае, незалежна ад аўдыторыі. Выявіў венгерскі амбасадар і сапраўдную іронію: „Мы вам так зайздросцім, у вас у Беларусі стае грошай на развіццё спорту, мы не можам сабе дазволіць падчас крызісу будаваць такія спартовыя палацы, мы вольныя грошы ў развіццё гаспадаркі ўкладаем".

Шкода толькі, што ў еўрапейскай палітыцы такіх асоб як венгр Ферэнц Контра ці кіпрыёт Хрыстас Пургурыдэс адзінкі. У сучаснай палітыцы дамінуе фальшыватварая маса без пазіцыі, асноўным чыннікам паводзін якой з'яўляецца прагматычная асабістая выгада.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

„Гданьскія біяграфіі"

17-18 кастрычніка 2009 г. у Гданьску адбыліся VI Дні нацыянальных меншасцей „Гданьскія біяграфіі". Арганізавалі іх прэзідэнт горада Гданьска Павел Адамовіч і Беларускае культурнае таварыства „Хатка", Згуртаванне літоўцаў у Польшчы, Мусульманская рэлігійная гміна ў Гданьску, Грамадска-культурнае таварыства яўрэяў у Польшчы, Саюз нямецкай меншасці ў Гданьску і Паморскі адзел Саюза ўкраінцаў у Польшчы. Імпрэза адбываецца ў такой формуле з 2004 г. Занесена яна ў каляндар пастаянных культурных мерапрыемстваў, якія фінансуюцца бюджэтам горада. Гданьск стараецца аб званьне Еўрапейскай сталіцы культуры ў 2016 г. Удзел меншасных арганізацый зводзіцца да супрацоўніцтва з рэфератам культуры Гарадской управы і забеспячэння адпаведнага прадстаўніцтва ў праграме. Сёлета „Біяграфіі..." адбываліся ў Двары Артуса і ў тэатры „Выбжэжэ", што сведчыць пра прэстыжны характар мерапрыемства. Гасцей у Двары Артуса пры Доўгім Таргу вітаў яўрэйскімі песнямі бард Караль Каладзей. Хары — агульнапольскі ўкраінскі „Жураўлі" пад кіраўніцтвам Яраслава Вуйціка і беларускі „Менка" з Мінска — выканалі рэлігійныя творы. Хор „Менка" пад кіраўніцтвам Кірылы Насаева праспяваў мінш. царкоўныя песні з „Супрасльскага ірмалагіёна" XVI ст., касцельныя песні на беларускай мове і беларускі рэлігійны гімн „Магутны Божа". Выступленні хароў звязаны былі з тэмай публічнай дыскусіі „Нацыя — рэлігія — тоеснасць", якую вёў дырэктар Радыё Плюс Адам Глябовіч. Пра ўплыў рэлігіі на нацыянальную тоеснасць гаварылі Мацей Канапацкі (на здымку), Альгірдас Уздзіла, Лена Глагоўская, Ірэна Губяк, Пётр Бартль.

Другі дзень нацыянальных меншасцей праходзіў у тэатры „Выбжэжэ". На вялікай сцэне адбыліся канцэрты, папярэджаныя прэзентацыяй кнігі Рышарда Катажынскага „Życiorysy niepoprawne". Па чарговасці выступілі Караль Каладзей, хор „Менка", літоўскі гурт „Аітра", „Жураўлі", татарскі гурт „Муслімас" з Вільні, „Данцыгер Клезмарын" з Гданьскім настаўніцкім хорам і балетнай групай „Харэа". Усе выканаўцы выступілі з народнымі і патрыятычнымі песнямі.

Пасля нацыянальных спеваў адбылося кулінарнае яднанне — прэзентацыя кухні розных народаў. Наш стол, як і ў папярэдніх гадах, прыцягваў гасцей смакамі і араматамі бульбяной бабкі, такой жа кішкі, соленых агурцоў і сала, хлебнага квасу, шмальцу з цыбулькай і яблыкамі, пірагоў са слівамі, мёду майго татка з Ярылаўкі ды зёлкавых гарбатак бабулькі Надзейкі з Беларусі і нашай Ані Мекінай. Варта згадаць, што бульбяную бабку спякла Гражына Кашалка, кішку — Ірына Гаданчук, хлебны квас падрыхтавала Аліцыя Рыбіцкая, соленыя агуркі і сала — Алесь Юзэфовіч, шмалец з яблыкамі — Марыся Юзэфовіч, шмалец з цыбулькай — Лена Глагоўская, пірог са слівамі — Марыся Палюховіч. Пішу пра гэта, бо гадамі ўсе мы ўжо спецыялізаваліся ва ўсіх гэтых стравах, якія прыцягваюць ці не найбольш публікі. Супольна з Алінай Крутэль (родам з Гайнаўкі), якая чарговы раз займалася арганізацыйнымі справамі беларускага прадстаўніцтва, удалося нават знайсці ў Гданьску нашы беластоцкія мясныя вырабы! Яны таксама смачна ўзбагацілі наш беларускі стол.

Лена ГЛАГОЎСКАЯ

Вачыма еўрапейца

Віртуальныя грошы

Крыху задзівіла мяне выказванне падляшскага ваяводы пана Мацея Жыўны, які прадбачыў, што ў будучым годзе не будзе нейкіх сур'ёзных інвестыцый звязаных з пабудовай і мадэрнізацыяй пагранпераходаў на адрэзку мяжы з Беларуссю з польскага боку. Гаварыў так пры нагодзе сустрэчы журналістаў з віцэміністрам замежных спраў Янам Баркоўскім, прысвечаным польска-беларускай дамове аб малым памежным руху:

— У 2010 годзе плануем, пры выкарыстанні інфраструктурных нарвежскіх і швейцарскіх сродкаў, утрыманне цяперашняга ўзроўню прац на дарожных польска-беларускіх пераходах у Полаўцах, Баброўніках і Кузніцы ды чыгуначным у Кузніцы, але яны непадрыхтаваныя на патрэбы малога памежнага руху. Няма на сённяшні дзень гарантаваных сродкаў на пабудову малых польска-беларускіх пагранпераходаў. Гэта яшчэ толькі хадайнічанні, каб быў дапушчаны пешы рух на пераходзе Рудаўка-Кужынец, які можна пакуль перасякаць толькі на байдарках.

Дадаў прытым, што на пабудову малых польска-беларускіх пагранпераходаў змогуць паявіцца магчымыя грошы ў рамках ажыццяўлення еўрасаюзнага праекта „Усходняе партнёрства".

— Гэта, аднак, залежыць ад абодвух бакоў. Не так ад ахвоты беларускага боку, але і ад фінансавых магчымасцей, значыць, магчымасці падрыхтоўкі інфраструктуры. Сам пагранпераход у Полаўцах для Беларусі — вялікае абцяжаранне. У рамках еўрасаюзнай праграмы „Польшча-Беларусь-Украіна" стараемся здабыць грошы на гэтую мэту, — дадаў.

Дзень пасля канферэнцыі, на якой журналісты пачулі гэтыя выказванні ад пана ваяводы, на адной публічнай дыскусіі ў ходзе Эканамічнага форуму „Добрасуседства" гаворка была якраз аб згаданай Праграме трансгранічнага супрацоўніцтва „Польшча-Беларусь-Украіна". Рэалізуецца яна ўжо ад двух гадоў і мае працягвацца да 2013 года. У яе рамках маецца для расходавання 186 мільёнаў еўра. Ірэна Якубоўская з Міністэрства рэгіянальнага развіцця тлумачыла, а ў прынцыпе прыгадвала, што „мэтай праграмы з'яўляецца падтрымка трансгранічных працэсаў развіцця". Яго прыярытэтамі з'яўляюцца: рост канкурэнтаздольнасці прыгранічных тэрыторый (паляпшэнне ўмоў для прадпрымальніцтва, падтрымка развіцця турызму, паляпшэнне камунікацыі), супрацоўніцтва паміж установамі (супольныя канферэнцыі, сустрэчы і г.д.) і ўрэшце паляпшэнне якасці жыцця жыхароў памежных рэгіёнаў. У гэтым апошнім прыярытэце гаворка перш за ўсё аб ахвое асяроддзя і... пабудове або мадэрнізацыі бяспечных і спраўных пагранпераходаў.

— Гаворым аб вялікіх праектах, — адзначала Ірэна Якубоўская.

Значыць, фактычна, як прадбачыў ваявода Жыўна, грошы на пагранпераход у Полаўцах амаль рэальныя, дастаткова толькі руку працягнуць па іх, асабліва таму, што цяпер, калі ў рамках рэалізацыі праектаў па праграме „Польшча-Беларусь-Украіна" бенефіцыенты, значыць, рэгіянальныя і лакальныя ўлады будуць мець магчымасць браць на іх задатак; дагэтуль праекты рэфундаваліся. Гэтая праграма, аднак, не вырашыць праблемы малых пагранпераходаў пасля ўступлення ў сілу дамовы аб малым памежным руху. Грошы на гэтую мэту ў рамках „Усходняга партнёрства" — пакуль што віртуальныя, падобна як здабыццё еўрасаюзных грошай на тое, каб зрабіць з Белавежы курорт з вялікім санаторыем, аб чым публічна мроіў шэф падляшскай Грамадзянскай платформы дэпутат Роберт Тышкевіч. Еўрасаюз, як вядома, не дае грошай от так. Трэба мець уласны ўклад, які часта складае 50 працэнтаў інвестыцыі. А тут варта прыгадаць, што бюджэт Белавежскай гміны вагаецца ў межах 6 мільёнаў злотых.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Міністр Латушка ў Беластоку

Фота Міры ЛУКШЫ

Міністр Павел Латушка ў размове з журналісткай Радыё Рацыя

Гэта быў першы візіт Паўла Латушкі пасля назначэння яго ў чэрвені на пасаду міністра культуры Рэспублікі Беларусь. Былы пасол гэтай краіны ў Варшаве, а раней генеральны консул у Беластоку два дні ў канцы мінулага тыдня адбыў шэраг г.зв. куртуазных сустрэч. Размаўляў з падляшскімі ваяводам Мацеем Жыўнам і маршалкам Яраславам Дважанскім, епіскапам Беластоцка-Гданьскай епархіі Іакавам, з прадстаўнікамі беластоцкага свету культуры і беларускімі дзеячамі. Прыняў таксама ўдзел у Гала-канцэрце фестывалю „Беларуская песня”.

У першы дзень візіту (на запрашэнне БГКТ), пасля куртуазных сустрэч з ваяводам, маршалкам і епіскапам Іакавам, у Культурным цэнтры Беларусі 36-гадовы міністр меў размаўляць з прадстаўнікамі перш за ўсё розных арганізацый беларускай меншасці ў Польшчы, культурных установаў Беластока. На сустрэчу прыйшло больш за дваццаць асоб з беларускага асяроддзя культуры. Запрошаныя гарадскія і самаўрадавыя ваяводскія ўстановы прадстаўлялі толькі дзве жанчыны (камандзіраваныя іх дырэктарамі) з Падляшскай філармоніі і оперы ды Беластоцкага лялечнага тэатра.

— Вельмі прыемна мне вярнуцца ў Беласток. Ёсць тут у мяне шмат сяброў, — пачаў сустрэчу (як адзначаюць некаторыя СМІ) беларускамоўны міністр.

Адзначыў, што як кіраўнік ведамства культуры будзе падтрымліваць культурныя кантакты Беларусі з усімі краінамі, а асабліва суседзямі, таксама з Польшчай:

— Культура будуе добрыя стасункі ў розных сферах таксама гаспадаркі і палітыкі. З'яўляецца базай, на якой можна будаваць добрыя адносіны з іншымі краінамі.

Абяцаў, што будзе падтрымліваць культурную дзейнасць беларускай меншасці ў свеце; выказаўся за супрацоўніцтва са згуртаваннем „Бацькаўшчына” (быў у Мінску на апошнім яго з'ездзе), між іншым таксама беларускай меншасці ў Польшчы:

— Беларуская меншасць можа разлічваць на падтрымку беларускіх улад.

Запэўніваў:

— Выказваем зацікаўленне, каб больш чужаземцаў наведвала нашы помнікі і іншыя аб'екты культуры. Будзем падтрымліваць дзейнасць турыстычных бюро, якія гэтым займаюцца.

Алег Латышонак, старшыня Беларускага гістарычнага таварыства хацеў даведацца, наколькі Беларусь зацікаўлена ўдзелам у адзначанні ў наступным годзе 600-годдзя бітвы пад Грунвальдам. Міністр Латушка заявіў:

— Размаўляў я на гэтую тэму з маршалкам Дважанскім [ёсць ідэя, каб польска-літоўска-беларускае святкаванне гадавіны сарганізаваць таксама на Падляшшы — М. Х.]. Мы зацікаўлены запрашэннем да ўдзелу.

У сваю чаргу галоўная частка святаў (інсцэніроўка бітвы) у Беларусі мае быць праведзена — як сказаў міністр — у Нясвіжы або ў Навагрудку („хутчэй у Навагрудку”). Маюць быць пастаўлены прысвечаны ёй дакументальны фільм, сарганізаваны выстаўкі і навуковая канферэнцыя, падрыхтаваная Беларускай акадэміяй навук. Павел Латушка аднёсся таксама да ідэі рэалізацыі мастацкага фільма аб бітве пад Грунвальдам, які меў быць пастаўлены ў літоўска-беларускай прадукцыі. На яго думку, гэты праект вельмі цікавы, але цяжкі для рэалізацыі. На яго думку, трэба было б папрацаваць над літоўска-беларускім сцэнарыем, які адпавядаў бы двум бакам. Пасля можна падумаць пра фінансавыя пытанні яго прадукцыі. Распытваны Алегам Латышонкам, ці ў Мінску стане помнік бітве 1410 года, беларускі міністр культуры адказаў:

— Ёсць такая прапанова, якая падтрымліваецца Міністэрствам культуры, але невядома ці стаў бы ён у Мінску ды невядома калі і дзе. Напэўна не ёсць гэта рэальным у 2010 годзе.

Юры Хмялеўскі, галоўны рэдактар штомесячніка „Czasopis” і дырэктар Гміннага асяродка культуры ў Гарадку пытаўся ў міністра Латушкі, ці намерваецца штосьці зрабіць, каб беларуская мова была ў Беларусі больш паўсюднай.

— Гэта павінен быць натуральны працэс. Міністр культуры фінансуе і драматургію, і спектаклі па-беларуску. Трэба пачынаць з самога сябе, паказваць уласны прыклад.

Дадаў прытым:

— Беларуская культура і беларуская мова гэта неад'емныя часткі.

Аб сваёй беларускамоўнасці сказаў:

— Для мяне беларуская мова — блізкая і родная. Для мяне з'яўляецца натуральным і лагічным, што як міністр культуры размаўляю па-беларуску.

Ян Сычэўскі, старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства і сустаршыня Таварыства беларускай культуры звярнуў увагу:

— Наша культура беларускай меншасці будзе кульгавай і беднай, калі не будзе мець кантактаў з прадстаўнікамі беларускай улады. Часта, — як сказаў, — ад „дыпламатычных капрызаў” залежаць працэдуры, звязаныя з выдачай віз выканаўцам з Беларусі, прыязджаючым на гастролі ў Польшчу.

— Культурныя адносіны патрабуюць больш ліберальных рашэнняў, — заўважыў міністр, дадаўшы, што Міністэрства культуры будзе, у рамках сваёй кампетэнтнасці, падтрымліваць гэтыя ініцыятывы. Пры нагодзе прыпомніў:

— Ад 2005 г. наш урад рэалізуе праграму „Беларусы ў Польшчы”, якая падтрымлівае меншасць. У 2010 г. не паменшым фінансавання беларускай меншасці ў Польшчы, а нават яе крыху павялічым.

Яшчэ да сустрэчы ў КЦБ „Ніве” ўдалося паразмаўляць з міністрам Латушкам.

— Аб якіх мерапрыемствах размаўлялі Вы з падляшскімі ваяводам і маршалкам?

— Думаю, што культурнае супрацоўніцтва паміж Падляшскім ваяводствам, Гродзенскай вобласцю і ў цэласці з Беларуссю, з усімі рэгіёнамі, — адносна актыўнае. Шмат калектываў штогод, штомесяц, а нават штотыдзень прыязджае ў Польшчу і наадварот. Вельмі важным з'яўляецца тое, што культурнае супрацоўніцтва — гэта той фактар, які стварае добрую атмасферу ў іншых сферах: палітычнай, гаспадарчай і г.д. Здаецца нам вельмі важнай стымуліроўка ўзаемнага культурнага супрацоўніцтва. Размаўлялі мы з ваяводам і маршалкам аб магчымасці абмену паміж Гродзенскай і Падляшскай філармоніямі, аб гасторлях беластоцкага Драмтэатра ў Беларусі і нашага Акадэмічнага нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы ў Польшчы, аб супольных культурных праектах, напрыклад, аб юбілеі 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Вядома, для рэалізацыі канкрэтных прапаноў патрэбны час. Важна, што ёсць узаемнае зразуменне, што такія мерапрыемствы трэба рэалізаваць.

— А як будзе выглядаць культурнае супрацоўніцтва агульнапольскага і агульнабеларускага характару?

— Я хацеў бы адзначыць, што ў кастрычніку па ініцыятыве Міністэрства культуры Беларусі быў створаны арганізацыйны камітэт ушанавання Шапэнаўскага года ў нашай краіне і з таго часу пачаўся шэраг мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца ўвесь год, і будуць прысвечаны гэтаму выдатнаму польскаму кампазітару. Нядаўна мелі мы магчымасць адкрыць міжнародную канферэнцыю ў Нясвіжы ў палацы Радзівілаў, які якраз праходзіць рэканструкцыю, з удзелам князёў Мацея і Мікалая, якія прыехалі да нас з Варшавы. Гаварылі мы аб пашырэнні супрацоўніцтва. Тыдзень таму меў я нагоду сустрэцца ў Беларусі з прапраўнучкай Станіслава Манюшкі і таксама размаўлялі мы аб супрацоўніцтве. У лістападзе чакаем прыезду рэжысёра Кшыштафа Занусі і акцёра Паўла Дэлёнга на міжнародны фільмавы фестываль. Беларусь — адкрытая на прыём польскай культуры. Спадзяемся, што таксама беларускія творцы (калектывы) з поспехам змогуць выступаць у Польшчы. Памятаем, што не так даўно ў Польшчы выступіў ансамбль „Стары Ольса”. Калі размаўляем, прыязджаў з канцэртамі Нацыянальны акадэмічны хор імя Генадзя Цітовіча і салісты прыватнага эстраднага цэнтра „Спомаш”. Неўзабаве мае быць пастаўлена ў Варшаве „Пінская шляхта” ў пастаноўцы нашага рэжысёра Мікалая Пінігіна. Спадзяюся, што такіх праектаў будзе больш. Вельмі важнае, каб мы падпісалі двухбаковы пратакол аб культурным супрацоўніцтве, які меў бы сістэмны характар і ўлічваў супрацоўніцтва нацыянальных бібліятэк і музеяў, вядучых тэатраў, кінематографа. Спадзяюся, што ў найбліжэйшы час польскі міністр культуры прыме маё запрашэнне і наведае Мінск з рабочым візітам. Наколькі ведаю, ніколі ў гісторыі незалежнай Беларусі і незалежнай Польшчы ў постсавецкі перыяд польскі міністр не быў з візітам у Беларусі. Нядаўна меў я прыемнасць гасціць міністра культуры Літвы, які быў апошні раз у Беларусі ў 1994 г. Патрэбныя кантакты ды візіты і маю надзею, што дойдзе да іх рэалізацыі.

— Калі Аўгустоўскі канал мае шанц быць занесеным у сусветны спісак трансгранічных помнікаў ЮНЕСКА? Што з адпаведнай польска-беларускай заявай?

— Я б хацеў перш за ўсё адзначыць, што Аўгустоўскі канал з'яўляецца нашай супольнай польска-беларускай культурнай спадчынай, ён належыць дзвюм краінам ды спалучае Польшчу і Беларусь. У верасні эксперт камісіі ЮНЕСКА, які адказвае за гэтыя справы, прабываў па запрашэнні міністраў культуры Польшчы і Беларусі ў абедзвюх нашых краінах ды аналізаваў актуальнае становішча Аўгустоўскага канала. Цяпер рашэнне на баку толькі ЮНЕСКА, але спадзяемся, што канал трапіць у гэты спісак.

— Пры нагодзе нашай размовы спытаюся ад імя Вашых „фанатак” на Беласточчыне. Як ацэньваеце сваю чацвёртую пазіцыю ў рэйтынгу на дзесяцёх найпрыцягальных мужчын у Беларусі, які апублікавала мінская „Наша ніва”?

— Першы раз пра гэта чую! *(смех — М.Х.)* Магу толькі сказць, што я ўсё нежанаты.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Скажэнне ў перамене часу

Штогод перасоўваем гадзіннікі на час летні і зімовы. Ініцыятарам гэтай „вынаходкі" быў аўтар амерыканскай канстытуцыі Бенджамін Франклін (ён быў не толькі палітыкам, але і вучоным). Следам ЗША пайшлі іншыя дзяржавы. У нашай краіне перамена часу паступіла ўпершыню ў міжваенны перыяд. Некалькі разоў правіла адмянялі, але з 1976 года па сённяшні дзень Польшча з'яўляецца „двухчасовай" дзяржавай. Прагматыкі канстатуюць, што перасоўванне гадзіннікаў, гэта скажэнне ў часе. Разважма затым факты.

Для асвятлення памяшканняў у гадавым маштабе расходуем 1% прадукцыі ўсіх электрастанцый. Гэта кропля ў моры таго, што выкарыстоўваецца пры вулічным асвятленні, у прамысловасці, транспарце ці сельскагаспадарчай вытворчасці. У выпадку вулічнага асвятлення дзейнічае фотамабільная тэхніка і на гэта не маем уплыву. Ліхтары запальваюцца пры змроку і выключаюцца на світанні. У другім выпадку, абмежаванне выкарыстання току абазначала б спавальненне прамысловай прадукцыі, а гэтым самым і прыбытку грамадзян. На такое не пагодзіцца ніякая ўлада. Прагрэс цывілізацыі застаўляе нас таксама да „камфортнага" жыцця. Карыстаемся кандыцыянерамі, большымі халадзільнікамі, тэлевізарамі, пральнымі машынамі. А гэта патрбуе большага расходу элетраэнергіі, чым асвятленне памяшканняў. Народы Азіі, Кітая, Японіі ці Індыі, напрыклад, ніколі не ўводзілі перамен у часе і гаспадарка іхняя стабільна развіваецца.

Абагульняючы вышэйсказанае, варта было б разважыць (эканамістам і палітыкам) магчыма даступныя ўсе „за" і „супраць" наконт прадстаўленай праблемы і прыняць рашучыя меры.

Уладзімір СІДАРУК

Калі дачакаемся?

У нашай суверэннай і прававой дзяржаве абавязвае шмат законаў, якія дазваляюць чыноўнікам на іх свабодную інтэрпрэтацыю. Стварае гэта пагрозу працвітання паталагічнай з'явы, якой з'яўляецца прадажніцтва. Грамадскасць ад даўжэйшага часу дапамінаецца закону, які прыцягваў бы да матэрыяльнай адказнасці чыноўнікаў за няправільныя рашэнні, званыя „памылкамі". Справа тычыцца перш за ўсё людзей бізнесу, паколькі не адна фірма ўжо пацярпела ад казначэйскай установы з прычыны назначэння няправільных падаткаў — прыклад пякарні з Зялёнай Гуры, ці валанцёрак з Быдгашчы, якім казна назначыла вялікія падаткі ад даравальных запісаў у карысць бяздомных і бездапаможных грамадзян.

У час праведзенага апытання 83% апытаных выказалася за ўвядзене закону, а 13% было супраць. Варта адзначыць, што праект ад года залежваецца ў парламенце. Калі рашэнне уступіць у сілу, цяжка прадбачыць. Лічу, што вынясенне СМІ гэтай справы на публічны форум з'яўляецца добрым прадвеснікам напярэдадні наступаючага года.

(ус)

З беларускім рэпертуарам

*Размова з **Верай МАСАЙЛА** — старшынёй Камісіі грамадскіх спраў Рады горада Гайнаўкі, раднай ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта, шматгадовай настаўніцай.*

— Працуючы ў Дзіцячым садку № 3 у Гайнаўцы, Вы апошнімі гадамі многа займаліся з дашкольнікамі па-беларуску, рыхтавалі пастаноўкі, вучылі дзетак спяваць і дэкламаваць на беларускай мове. Вашы дашкольнікі часта перамагалі на аглядах і конкурсах.

— Працуючы з дашкольнікамі, я вельмі радавалася, калі пачула, што яны нешта сказалі па-свойму пачутае дома. Здараліся і дзеткі, што ўмелі гаварыць па-нашаму. Нават пры канцы маёй работы ў прадшколлі вельмі актыўным дашкольнікам, выступаючым у беларускіх пастаноўках, быў Гаўрылка Сураль, які добра ўмеў гаварыць па-свойму. На рабоце я старалася і загаварыць па-нашаму да дзетак. Калі я даведалася, што ў беларускіх конкурсах могуць выступаць дашкольнікі, рашылася падрыхтаваць сваіх дзетак да выступаў са сваім рэпертуарам. Спачатку ў 2006 годзе мы паехалі на дэкламатарскі конкурс „Роднае слова" і мае дзеткі занялі на цэнтральных элімінацыях 3 першыя месцы і адно вылучэнне. У гэтым самым годзе мы выступілі ў II Конкурсе дзіцячай песні нацыянальных меншасцей у Прадшколлі № 14 у Беластоку і атрымалі там Гран-пры. Хвалілі там нашых дзетак за выступы сола, ў дуэце, тэрцэце і з цэлым калектывам. Я тады была вельмі рада выступам Гаўрылкі Сураля, Ані Чыквін, Кшыся Грыгарука, Евы Галёнкі, Олі Іванюк і Ані Раманюк. Пазней быў конкурс беларускай песні для школьнікаў. Адтуль мы таксама вярнуліся з прызамі. З „Казкай пра рыбака і рыбку" паехалі на Конкурс малых сцэнічных форм і занялі першае месца. Я вельмі цешылася, што мы ў 2006 годзе толькі пачалі выступаць з беларускім рэпертуарам і адразу столькі разоў перамагалі.

— У 2006 годзе Вы атрымалі ўзнагароду бурмістра горада Гайнаўкі...

— Узнагароду бурмістра я атрымала перад усім за падрыхтоўку дзетак да конкурсаў на беларускай літаратурнай мове. У школьным годзе 2006/2007 мы выступілі з казкай „Казуля і лгуля", дэкламавалі беларускія вершыкі і спявалі беларускія песні. На ўсіх беларускіх конкурсах атрымлівалі прызавыя месцы або вылучэнні. У час III Конкурсу дзіцячай песні нацыянальных меншасцей не прызначалі ўжо месцаў, але пахвалілі нашы выступы. У 2008 годзе на абрадавым аглядзе ў Гайнаўскім доме культуры мы выступілі з „Вячоркамі". Пазней ездзілі з гэтым абрадам на беларускі вечар у Беласток. У школьным годзе 2007/2008 нашы дзеткі таксама паспяхова выступалі з беларускімі песнямі і вершыкамі.

— У прадшколлі дзеткі не ўмеюць яшчэ чытаць па-беларуску. Хіба бацькі таксама мусілі многа працаваць з дзеткамі?

— Вершыкі або тэксты сцэнак я пісала дзеткам лацінкай і бацькі дапамагалі ім вучыцца. Бывала, што дзеткі нават папраўлялі вымаўленне бацькоў.

— Вы са сваімі дашкольнікамі перамагалі таксама на калядных аглядах.

— Яшчэ перад выступамі на беларускіх конкурсах я рыхтавала дзетак да прэзентацыі калядак на аглядзе ў Гайнаўскім белліцэі. Дзеткі, з якімі я працавала, таксама станавіліся пераможцамі. Пасля ў нашым прадшколлі калядкамі стала займацца настаўніца Божага закону. Калі агляды калядоўшчыкаў сталі ладзіцца ў Гайнаўскім доме культуры, я ізноў стала рыхтаваць дзетак да выступаў з каляднымі творамі. У апошніх гадах мы занялі першае і іншыя прызавыя месцы.

— Вы хіба любілі сваю работу, бо нават на пенсіі надалей працуеце з дашкольнікамі?

— Кожны мае нейкія свае зацікаўленні. Мяне заўсёды цікавіў наш беларускі рэпертуар. Я вельмі любіла працаваць з дзеткамі. Частыя перамогі нашых дзетак вельмі моцна падбадзёрвалі мяне да работы. Калі я адыходзіла на пенсію, звярнулася з просьбай да дырэктаркі Прадшколля № 3 даць мне магчымасць папрацаваць яшчэ з дзеткамі пры падрыхтоўцы да беларускіх конкурсаў. Нават бацькі дашкольнікаў запрапанавалі нашай дырэкцыі, каб надалей працаваў рэгіянальны гурток і каб я займалася ў ім з дзеткамі. Я напісала праграму дзейнасці рэгіянальных майстар-класаў, але не далі мне ўжо магчымасці папрацаваць у прадшколлі. Я тады стала займацца з дзеткамі па-за прадшколлем. Пазней дырэктар ГДК даў мне магчымасць займацца з дашкольнікамі і старэйшымі вучнямі ў доме культуры і я стала там працаваць інструктарам. Сустракалася я з дзеткамі пасля вучобы, а ў дні, калі дом культуры быў закрыты, а трэба было рыхтавацца да конкурсаў, сталі мы сустракацца ў прыхадскім доме пры Свята-Троіцкім саборы. У ГДК займалася са мной 16 маладых людзей — дашкольнікі, вучні падставовай школы і гімназісты. Мы ў школьным годзе 2008/2009 таксама ездзілі на беларускія конкурсы, агляды і там дабіваліся поспехаў. Вельмі цікавай атрымалася наша пастаноўка „Сватоў", а на конкурсе беларускай песні вельмі прыгожа спяваў наш калектыў „Званочкі" з пяці чалавек (Аня і Матэвуш Чыквін, Павел і Пётр Аксенціюк і Матэвуш Харкевіч).

— Ці надалей маеце намер весці гурток пры Гайнаўскім доме культуры і рыхтаваць дзетак да выступаў па-беларуску?

— Частка нашых вучняў пайшла ўжо ў гімназію і трэба будзе шукаць новых ахвотных займацца з беларускім рэпертуарам. Калі сямейныя справы не перашкодзяць, я пастараюся зрабіць усё, каб надалей весці гурток. Карыстаючыся нагодай, звяртаюся я з заклікам да дзетак ахвотных дэкламаваць вершыкі, выступаць з пастаноўкамі або спяваць песні па-беларуску, каб уключаліся ў працу нашага гуртка. Бацькі могуць кантактавацца ў гэтай справе з сакратарыятам Гайнаўскага дома культуры або непасрэдна са мной, па тэлефоне 022 2196838.

— Ужо амаль тры гады Вы працуеце ў Радзе горада як радная ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта і з'яўляецеся старшынёй Камісіі грамадскіх спраў. Удалося вам разам з сябрамі ад БНВК пераадолець цяжкасці і давесці да прыняцця пастановы аб увядзенні дапаможнай беларускай мовы для зносінаў жыхароў Гайнаўкі з працаўнікамі магістрата. У выніку Гайнаўка зараз занесена ў краёвы спісак мясцовасцей, якія маюць устаноўленую дапаможную мову. Калі можна спадзявацца ўказальнікаў па-польску і па-беларуску?

— Хаця апазіцыя ў Радзе горада была незадаволеная нашым праектам пастановы аб увядзенні дапаможнай мовы, то ўдалося яго прыняць. Мне здаецца, што трэба зрабіць чарговы крок і прыняць пастанову па ўстанаўленні дадатковых назваў мясцовасцей на мове беларускай нацыянальнай меншасці. Гаварылі мы ўжо аб гэтым у клубе БНВК і я думаю, што вернемся да гэтай справы.

— На кароценькай вулічцы Янкі Купалы паложаны польбрук, а на вуліцы Якуба Коласа надалей многа ямак.

— Апазіцыя ў нашай радзе была таксама супраць прысваення дзвюм вуліцам імён беларускіх пісьменнікаў, Якуба Коласа і Янкі Купалы, аднак і тут цяжкасці ўдалося пераадолець. Нядаўна я даведалася, што магістрат плануе асфальтаваць вуліцу Якуба Коласа. Не ведаю, аднак, калі гэты план будзе рэалізаваны.

— Зараз ёсць магчымасць, каб ужо дашкольнікі пачыналі вучыцца па-беларуску. Як гэтая справа маецца ў гайнаўскіх садках?

— У гайнаўскіх прадшколлях няма яшчэ ніводнай групы, якая вучылася б па-беларуску. Каб стварыць такую групу, трэба каб прынамсі 7 бацькоў або юрыдычных апекуноў, якіх дзеці вучацца ў прадшколлі, падалі пісьмовую заяву з просьбай вучыць іх дзетак па-беларуску. Калі няма 7 дзетак у адной групе, можна стварыць міжкласную групу. Зараз ужо позна запісваць дзетак на гэты школьны год, але да 30 красавіка 2010 года можна падаваць заявы на наступны школьны год. Клуб БНВК намагаецца, каб у бацькоўскай заяве, на аснове якой дзіця прымаецца ў прадшколле, побач магчымасці навучання Божага закону і замежнай мовы было месца на паметку аб магчымасці вучобы па-беларуску. Аднак гэтая справа яшчэ нявырашана і покі трэба па-старому падаваць асобныя заявы.

— Дзякую за гутарку.

Размаўляў Аляксей МАРОЗ

Дракула расслаўляе краіну

Тэкст і фота Юркі ЛЯШЧЫНСКАГА

Бюст графа ў яго доме нараджэння

Уступ

Апошнім часам трапіла мне ў рукі кніжка амерыканскай пісьменніцы Элізабет Каставай „Гісторык". А ў галіне мастацкага фільма, крыху на хвалі зацікаўлення творчасцю Рамана Палянскага, глядзеў я крыху прызабыты, але дасканалы фільм „Нястомныя пераможцы вампіраў". Так кніжка, як і фільм датычаць славутага румынскага літаратурнага, гістарычнага персанажа — графа Дракулы. І так сабе я ўсведаміў, што Трансільванію, ці шырэй Румынію, расславіў менавіта гэты герой — так ці інакш становячыся яе візітнай картачкай.

Таму, калі галоўны рэдактар „Нівы" ў чарговы раз заахвочваў мяне перанесці на паперу свае ўражанні ад падарожжаў, я не меў сумневу з чаго пачаць. Пачну з Румыніі. Другой прычынай няхай будзе тое, што гэтая краіна яшчэ не так стаптаная турыстамі. З часам пэўна раскупяць яе немцы або французы ці расійская мафія, але яшчэ не сёння. Дык што ж, як кажуць у Рымыніі — *Drum bam!* (Шчаслівай дарогі!)

I

Збіраючыся ўпершыню ў падарожжа па Румыніі, я спадзяваўся на многа ўражанняў. Ведаў пра гэтую краіну і шмат, але, як потым аказалася, зусім не так і многа. „Па слядах графа Дракулы" — такі быў лозунг экскурсіі, з якой я падаўся ў таямнічы свет мінулых стагоддзяў.

Ведаць пра Дракулу з кніжак ці фільмаў, а сустрэць яго — гэта, як потым аказалася, дзве розныя справы. Месцаў, звязаных з жыццём мінулым (тленным) ды пазнейшай дзейнасцю графа на тэрыторыі сённяшняй Румыніі не так і многа. Праўда, ірландскі пісьменнік Брам Стокер у славутым рамане з 1897 года даволі багата і свабодна назначае месцы, звязаныя з яго постаццю. Праўда, літаратурная выдумка Стокера — для сённяшніх спецыялістаў па прамоцыі турызму, а Дракула — гэта візітная картачка, магніт, нават даспадобы такая геаграфія Дракулавых слядоў. Хаця граф у многіх з апісаных месцаў ніколі не быў, мала таго — у ягоны час не існавалі тыя ж замкі, куды водзяць турыстаў. Тут варта сказаць, што герой рамана ірландскага пісьменніка — сапраўдная, гістарычная постаць — валошскі ваявода Улад Коласадзіцель, інакш Vlad Tepes. Жыў ён у 1431-1476 гадах, а нарадзіўся ў старажытным горадзе ў Трансільваніі Сігішоара (Sighisoara — па-румынску, Segesvar — па-мадзьярску, Schassburg — па-нямецку). Ваяваў за незалежнасць свае краіны з мадзьярска-каталіцкай экспансіяй і мусульманска-турэцкім нашэсцем. Раз перамагаў, іншым разам яго перамагалі. Трапляў у палон — і мадзьярскі, і турэцкі. Вызвалялі яго, і ён зноў хапаў за зброю і змагаўся. Быў ваяром бязлітасным і крывавым, а сваіх ворагаў і палонных любіў пасадзіць на кол і любавацца, як мучацца. Адтуль і мянушка — Коласадзіцель. Магчыма, што хварэў ён гемафіліяй, таму патрабаваў крыві (хаця гэта шыта белымі ніткамі) і піў яе.

З гістарычнага пункту гледжання ягоным бацькам быў таксама рыцар ордэна Драконаў Улад Дракул. Мабыць і адтуль мянушка сына Дракула — ужо прыдуманая пазней. Дарэчы, у народных легендах дракул абазначае д'ябла, чорта, хаця хутчэй гэта дракон — цмок. Як і ўсё тадышняе змаганне, так і ягонае было трагічнае. Бацьку закатавалі ворагі, роднага брата жыўцом пахавалі, а жонка-княгіня, адмаўляючыся здацца наступаючым на іхні замак Поенар асманскім туркам, кінулася са сцен замка ў яр. Граф Улад Коласадзіцель быў прымушаны здацца мадзьярам, а каб ажаніцца з сястрой караля Мацея Корвіна — яшчэ горш: прымусілі яго перайсці на каталіцтва! Паводле легендаў, напярэдадні Каляд 1476 года яго замардавалі, а ягонае абезгалоўленае цела было знойдзена ў манастыры Снагаў (Snagov) недапалёк Бухарэста. Там праўдападобна і быў пахаваны. Аднак, калі стаў легендай, значыць, у пачатку XX стагоддзя, у ягоным мінулым пачалі капацца археолагі. У 1931 годзе аказалася, што іхнія працы не даюць адназначных адказаў. Праўда, у капліцы манастыра Снагаў быў знойдзены касцяк чалавека, але з чэрапам каня. І што горш: цяжка было ўстанавіць лучнасць паміж знойдзеным шкілетам і графам Дракулам. Тым не менш легенда змагара і героя ажыла ў час незалежнасці Румыніі, асабліва ў перыяд Нікалае Чаўшэску. Бо змагаўся ён з чужым нашэсцем, спыніў рэкрутацыю румынскіх юнакоў у турэцкую армію, раздаваў гаспадарам зямлю і фундаваў многа праваслаўных храмаў.

У Бране Дракула ніколі не быў

У сённяшняй Трансільваніі з графам-вампірам звязаных маем некалькі месцаў. Замак, а дакладней яго руіны — Поенар (Poienari). Зараз гэтае месца больш вядомае па прычыне вадаёма на рацэ Арэс і аграмаднай гідраэлектрастанцыі. Аднак не ўсе экскурсіі туды ездзяць. Сталіца Валошчыны Тырговіштэ (Targoviste) у час Дракулы. Згаданы манастыр Снагаў і Сігішоара і Бран. Сігішоара, якой верхні горад занесены ў спісак сусветных жамчужын ЮНЕСКА, сапраўды вартая таго, каб яе наведаць, нават на даўжэй. Тут знаходзіцца дом-камяніца, дзе сапраўды нарадзіўся наш герой. На сцяне мемарыяльная дошка, у сярэдзіне музей, а там бюст графа і іншыя памяткі з таго часу. Вежа з гадзіннікам вышынёй у 64 метры, а ў ёй музей... катавання — катоўня. Ёсць „школьныя ўсходы", па якіх можам дайсці да аднаго з найбольш прыгожых могільнікаў цэлай Трансільваніі, шмат сакральных аб'ектаў ды муры і вежы. Горад сам сабою шмат гаворыць пра шматкультурнае мінулае і сённяшні дзень. Побач пратэстанцкіх і каталіцкіх знаходзяцца праваслаўныя храмы. Для аматараў гульняў і мастацтва кожны год ладзіцца ў Сігішоары „Сярэднявечны фестываль" з канцэртамі, вулічнымі тэатрамі і ўсяночнымі забавамі. Але на працягу года мястэчка даволі спакойнае. У пачатку чэрвеня сустрэў я толькі адну замежную экскурсію — з Ізраіля — румынскіх яўрэяў.

З меракантыльнага пункту гледжання, Дракулавай візітнай карткай Трансільваніі з'яўляецца мястэчка і замак Бран, непадалёк Брашава. Хаця, як устанавілі гісторыкі, у гэтым каралеўскім замку Дракула ніколі не быў. Але раман Стокера зрабіў сваё. Вязуць сюды ўсе экскурсіі. Не даязджаючы да замка сустракаем цэлую процьму ларкоў з самымі рознымі Дракулавымі сувенірамі. Тут купіць можна партрэт графа, CD з музыкай з фільмаў пра яго і... часнок. Гэта менш вартасныя тавары, больш за тое тут усялякіх абрусаў, капаў — проста звычайнага народнага мастацтва. А сам замак Дракулы — як замак. Добра захаваны, з цікавымі краявідамі з акон і многімі экскурсіямі, якія праходзяць адна за адной. Экскурсаводы, хаця гэта было пару месяцаў да ўваходу Румыніі ў Еўрасаюз, прынцыпова распавядаюць на англійскай мове. Замежная экскурсія, значыць — і замежная мова, хаця ў нашай групе была перакладчыца — полька, студэнтка Універсітэта ў Бухарэсце і нават прасілі мы гаварыць на мове „нацыянальнага героя". Мабыць, таму, што Дракула ніколі тут не быў, не адчулася гэтых эмоцый і настрою. От, яшчэ адзін замак, хаця ў пэўным сэнсе ягоны дух спрыяў мне. Традыцыйна, на замкавым дзядзінцы знаходзіцца калодзеж, куды турысты кідаюць праз плячо грошы, выказваючы свае пажаданні. І мае два здзейсніліся! Першае, традыцыйнае, каб сюды вярнуцца яшчэ. Вярнуўся праз год. Другое (а стаяла летняя спякота), каб як мага хутчэй выпіць куфаль піва. Праз пару хвілін смакаваў я „урсус" (orsus), самае лепшае румынскае піва! І гэта станоўчы вобраз горада Дракулы.

(працяг будзе)

Седльцы і Ваўкавыск — гарады -пабрацімы

На сённяшні дзень у горада Седльцы сем замежных гарадоў-пабрацімаў, сярод якіх беларускі Ваўкавыскі раён. Дамова аб супрацоўніцтве з Ваўкавыскам была заключана 28 верасня 2000 года. Гарадскія ўлады заўсёды падкрэсліваюць значэнне для жыхароў горада міжнароднага супрацоўніцтва. У абмене ўдзельнічаюць перш за ўсё моладзь і мастацкія калектывы. Сядзьчане прымаюць гасцей пераважна ў даканікульны перыяд на „Днях Седльцаў". А свае дасягненні прэзентуюць яны за мяжой падчас самаўрадавых святкаванняў у паасобных краінах. Напрыклад, у Ваўкавыску апошнім часам пабываў Хор горада Седльцы .

Інфармацыю пра гарады-пабрацімы можна сустрэць у важных кропках горада. Герб Ваўкавыска віднеецца пры ўездзе ў Седльцы і на будынку Гарадской управы. Цяпер былі ўстаноўлены адлегласці да партнёрскіх гарадоў і ўсталяваны ў цэнтры горада ўказальнік. Паказвае ён напрамак да гарадоў-пабрацімаў, адлегласць і нацыянальня колеры. З Седльцаў у Ваўкавыск — 304 км.

Адам Бобрык пры ўказальніку сядлецкіх гарадоў-пабрацімаў

— Гэта самы блізкі па адлегласці горад-пабрацім, — сказаў віцэ-старшыня Рады горада Седльцы д-р Адам Бобрык. — Гэты фактар уплывае і на актыўнасць кантактаў. Дзякуючы гэтаму ў Седльцах многа прыяцеляў Беларусі, а ў Ваўкавыску — Польшчы. Кантакты пераломліваюць стэрэатыпы і збліжаюць нашы народы. Гэта таксама заслуга шматлікіх людзей, якія ўключыліся ў гэты працэс, такіх як хаця б Дзмітрый Голец і Ігар Кашкевіч з беларускага боку. Усталяванне ўказальніка гэта не толькі ўшанаванне нашых прыяцеляў з Беларусі і іншых краін, але перш за ўсё ўвекавечанне распачатых ініцыятыў, а таксама свайго роду напамін і заахвочанне жыхароў да супрацоўніцтва.

Седльцы — павятовы цэнтр у Мазавецкім ваяводстве. Першая пісьмовая згадка аб ім паходзіць з 1448 года. Гарадское права Седльцы атрымалі ў 1547 г. Горад распаложаны пры галоўным камунікацыйным дарожным і чыгуначным шляху, які спалучае ўсход і захад Еўропы. Па ліку насельніцтва займае ён 48 месца ў Польшчы і налічвае каля 78 тысяч жыхароў.

(гак)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Беласток — добры прыклад!

Дашкаляты з другой „Б” групы з дырэктар Луцыяй Неміровіч, Альжбетай Баравік і Альжбетай Андрасюк

У беларускім прадшколлі ў Беластоку „Зорку” прывіталі песняй пра вожыка. Гэтага звярка чамусьці прыгадваем восенню. Ён, быццам, сімвал гэтай паравіны года. Часта на яго спіне наколаты яблыкі, грыбы, каляровыя лісты...

Дзеткі ведаюць, што вожыкаў нельга насіць на руках. Звярок не любіць, калі яго лашчаць і галубяць. У яго — калючкі і можна імі параніць рукі. Іншая справа спяваць песні і развучаць вершыкі пра вожыкаў. У беластоцка-беларускім прадшколлі працуе музычна-тэатральны гурток. У ім многа класных салістаў, дэкламатараў і акцёраў. Дастаткова згадаць хаця б Дамініку Казлюк ці Асю Мусько. Прыклад ідзе зверху — прыгожа спяваюць усе настаўніцы. Мы сустрэліся дзень да Свята беларускай культуры, на якім выступяць настаўніцы і праспяваюць на тры галасы народную песню „Даліна”.

У прадшколлі арганізуюць мерапрыемствы не толькі для дзяцей. Вось, 13 лістапада г.г., у садку адбудуцца „Запусты” для бацькоў. Пасля ажыццявіцца праект „Посныя сустрэчы”. У атмасферу піліпаўскіх абрадаў і звычаяў будуць уводзіць народныя творцы. Дзеткі пазнаёмяцца з рукадзеллем, поснымі стравамі. Супольна будуць рыхтавацца да Каляд. І, як кожны год, малыя і дарослыя сустрэнуцца за калядным сталом...

Народныя абрады, звязаныя з паравінамі года, паказваюць нам як сябраваць з прыродай. Пасля канікулаў будынак садка — як новы. Пасля рамонтаў ён здаецца больш прасторным і каляровым. Дзеткі могуць прабываць у ім аж да 19 гадзіны вечара. Іншая справа — не так проста дастацца ў беларускія групы. Некаторыя чакаюць „у чарзе” , бо не хапае ўсім месца. У бягучым годзе працуюць тры беларускія аддзелы з 82 навучэнцамі (усіх дашкалят у садку 163 асобы).

Пасля амаль усе выпускнікі беларускіх груп, як у мінулым годзе, ідуць у „чацвёрку”, у якой маюць магчымасць вывучаць родную мову. Таму нашы бацькі з Гайнаўкі, Бельска, Гарадка ці Чаромхі павінны браць прыклад з беластачан.

ЗОРКА
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Язэп Лёсік

Вожык

Ці трымалі вы калі-небудзь вожыка? Калі не, то папрабуйце. Гэта вельмі цікавае стварэнне, а калі ёсць у хаце мышы, дык будзе вялікая карысць, бо вожык умее лавіць мышэй лепш за ката.

Дзікі вожык спачатку баіцца чалавека, але потым прывыкае ды пачынае жыць у хаце, як кот ці сабака. Улетку вожык есць жукоў, конікаў, чарвякоў; узімку ловіць мышэй, любіць булку з малаком, есць і садавіну, а калі няхват гэтага корму, то будзе есці ўсялякае мяса.

Усю зіму вожык, калі жыве на волі, спіць, закапаўшыся дзе-небудзь у мох. Сон гэты, як відаць, патрэбен вожыку, бо калі не даць яму заснуць, то ўлетку ён хварэе, а часта і здыхае. Дзеля гэтага яму трэба даць заснуць хоць на адзін месяц.

У няволі вожык можа пражыць некалькі гадоў, калі яго добра даглядаць. Нядобра толькі трымаць вожыка ў хаце дзеля таго, што ён цэлую ноч шныпарыць па хаце ды не дае спакойна спаць. Але часамі ўдаецца адвучыць яго ад гэтага, толькі нельга стрымаць вожыка ў месячную ноч: тады ён робіцца вельмі рухлівым, трывожыцца ды бегае па хаце.

Артур Вольскі

Вожык -дзівачок

Вожык,
вожык,
дзівачок!
Не сціскайся
ў кулачок.
Я наліў
для дзівачка
поўны сподак
малачка.
Але вожык-дзівачок
не глядзіць
у гэты бок.
Малака
не хоча ён
і тупоча на балкон.
Ды няма
з балкона сцежак —
ні лясной,
ні палявой.
Толькі пахне
вецер свежы,
пахне лісцем
і травой!

Міра ЛУКША

Конь з Канюшок

Стаіць хата на канцы гэтай вёскі.
У хаце той жыве дзед Канікоўскі.
У дзеда — конь, з адной конскай сілай.
Дзеду і каню ў Канюшках жыццё міла,
бо ў канцы вёскі ім ніхто не мяшае,
бо іх хаты, так сказаць — хаты з краю.
Колькі сілы ў старых? Не так многа,
ды спраўляюцца неяк дзве нябогі:
дзед каню ўкосіць сам канюшыны,
конь вядзе дзеда ў лес па маліны.
І вядуць яны разам ціха размову,
ідуць разам — у нагу і падкову.
Конь — Лявон той, а дзед — Панцялей.
Разам ім — весялей і шпарчэй.
Воз пад стайняй без працы тырчыць —
конь не мусіць дзеда вазіць.
Дзедаў ровар пад стрэшкай стаіць.
Сядзе дзед на ровар і мчыць,
а тады за ім наўздагон
з сівай грывай на ветры — Лявон!

Дубічы-Царкоўныя

Першая згадка пра вёску датуецца 1553 годам, калі Жыгімонт Аўгуст выдаў прывілею на пабудову царквы ў гэтай мясцовасці. Дубічы, якія ў той час называліся таксама Жарывец, належалі да кляшчэлеўскай арэнды і займалі 60 валокаў.

Згодна з паданнем, першы дубіцкі храм святых Пятра і Паўла, што знаходзіўся ва ўрочышчы Бахматы, праваліўся пад зямлю. І сёння на Вялікдзень тут можна пачуць гудзенне царкоўных званоў, з-пад зямлі. Іншая легенда гаворыць пра пажар старой святыні, з якога ацалела толькі ікона Божай Маці. Вецер панёс ікону і затрымаў у месцы, дзе быў узведзены новы храм.

Адну з чарговых цэркваў у Дубічах пабудаваў у 1729 годзе а. Ігнат Міхнякевіч. У XIX стагоддзі святарскую дзейнасць вялі тут прадстаўнікі роду Краскоўскіх, якія ўкаранялі асвету сярод мясцовых беларусаў. У 1908 годзе па іх ініцыятыве ў Дубічах была створана народная бібліятэка. Найбольш вядомым прадстаўніком роду быў Іван Краскоўскі (1880-1955), беларускі педагог, грамадскі і палітычны дзеяч.

Сённяшняя царква Пакрова Божай Маці была пабудавана ў 1946-1953 гадах на месцы спаленай ў 1941 годзе святыні з 1729 г. Галоўныя прыхадскія святы ў Дубічах-Царкоўных — гэта святых Пятра і Паўла (12 ліпеня) і Пакрова БМ (14 кастрычніка).

У 1941 годзе на лініі Дубічы Царкоўныя — Грабавец адбылася бітва паміж савецкімі і нямецкімі войскамі, падчас якой часткова згарэлі Грабавец і Дубічы.

Сёння Дубічы-Царкоўныя — сядзіба гміны. У вёсцы 4 вуліцы: Галоўная, Паркавая, Аседлевая і Лясная. У побытавым падзеле вылучаюць тры часткі Дубічаў: Крынычына, Сэло і Туркі.

Апрача царквы ў Дубічах варта наведаць Музей народнай культуры і пажарнай традыцыі, які месціцца ў будынку старой школы з пачатку XX стагоддзя, прыхадскія могілкі, а таксама старыя драўляныя хаты (напрыклад, тая, якая месціцца па вул. Галоўнай, 34). Цікавым і арыгінальным аб'ектам з'яўляецца помнік салдатам Савецкай Арміі, які знаходзіцца пры вуліцы Паркавай.

Міхась СЦЕПАНЮК

Музыка з кайфам

Лявон-прафесіянал

Кожны мае сваіх музычных герояў. Я таксама. Але ўспомніце, калі з гэтымі героямі вы пазнаёміліся. Неабавязкова, зразумела, асабіста, працягнулі руку, дзякавалі за музыку або словы. Падумайце, калі вы зразумелі, што канкрэтны выканаўца гэта ваш герой, ваш любімы музыка, мастак і чалавек. Такіх гісторый пра сустрэчу з кумірам чула я не адну, але самымі цікавымі былі сустрэчы маіх сяброў з беларускімі мастакамі гукаў. Адзін з іх — Лявон Вольскі.

Яшчэ некалькі гадоў таму здаваўся ён неад'емнай часткай гуртоў „Н.Р.М.", а раней „Мроя". Зараз Лявон Вольскі адстаў ад сваіх гуртоў і, безумоўна, з'яўляецца незалежным мастаком. Надалей працуе з „Н.Р.М.", з якім звязаны з самога пачатку, з 1994 года. „Мрою" заснаваў ён яшчэ ў 1980-х гадах з Алегам „Алезісам" Дземідовічам, з якім іграе да гэтай пары, ды з Уладзімірам Давыдоўскім, сёння журналістам (першапачаткова гурт называўся „Фаварыт"). Разам пачалі ствараць у самы важны перыяд развіцця беларускай рок-музыкі. І хаця б таму, што час гэты стаў легендарным, Лявон Вольскі да сёння застаецца магутным выканаўцам на беларускай сцэне. Аднак ягонай магутнасці не адчуем у непасрэдным кантакце. Ён не з роду мегаламанаў, толькі даволі стрыманы, пазітыўны чалавек з галавой поўнай мастацкіх фантазій. Са шматлікіх музычных і літаратурных планаў здзейсніў прынамсі пару. Напэўна паспяховым стаў „Зэт" — авангард і энергія. Таксама і „Крамбамбуля" — арыгінальны, нават можна сказаць, святочны гурт. Некаторыя кажуць, што створаны ён дзеля камерцыйных мэт, як кажуць у Беларусі — для тоўста фінансаваных выступаў на карпаратывах. Але чаму не? Калі можна падзарабіць арыгінальнай творчасцю, нават больш камерцыйнай, але не забываць пра мастацкую, ідэйную дзейнасць, дык гэта ж не такі вялікі грэх. Тым больш, што жыць з беларускамоўнай музыкі нялёгка. Лявон Вольскі мае многа твораў, зразумела музычных. Пра іншыя чым рок-музычныя раскажу праз тыдзень. Тады зразумееце чаму марай не аднаго з маіх сяброў было пазнаёміцца з Лявонам Вольскім.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 44

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 40:

Жыццё, пот, баба, род, канон, шанс, жаль, сэнс, эліксір, сіні, Лама, хатка, на. Жарт, дух, цуд, жэст, шалі, каліна, банькі, шанс, бо, сіні, пантэра, талісман.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі **Паўліна Юрчук** з Гайнаўкі і **Рафал Вакулюк** з Арэшкава.



Рэзюмэ даклада Віталя Барабаша з Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, зачытанага 25 верасня 2009 года на Міжнароднай канферэнцыі „Шлях да ўзаемнасці"

Беласточчына ў савецка-польскай канфрантацыі ў 1943-1944 гадах

(Тэрмін Беласточчына адносіцца ў гэтай працы толькі да былой Беластоцкай вобласці ў межах Заходняй Беларусі, якая ахоплівала м.інш. Скідальскі, Гродзенскі і Ваўкавыскі раёны з усходу, Сапоцкінскі, Аўгустоўскі, Граеўскі і Кольнаўскі з поўначы, Ломжынскі, Снядоўскі, Чыжаўскі і Цеханавецкі з захаду ды Бранскі, Бельскі і Свіслацкі з поўдня; раёны Сямятыцкі, Высокаўскі, Кляшчэлеўскі і Гайнаўскі — значыць Белавежская і Мельніцкая пушчы — былі па-за тагачаснай Беласточчынай, яны былі ў складзе Брэсцкай вобласці БССР — А.В.)

У выніку прасоўвання савецка-нямецкага фронту на захад, у пачатку 1943 года адной з галоўных задач савецкага камандавання было разгортванне масавага партызанскага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Гэтаму пытанню былі прысвечаны рашэнні V пленума ЦК КП(б) Беларусі, які прайшоў у Маскве 26-28 лютага 1943 года. Лінію гэтага лютаўскага пленума працягвалі рашэнне ЦК КП(б)Б у прынятай 22 чэрвеня 1943 года пастанове аб далейшых мерапрыемствах па разгортванні партызанскага руху ў заходніх абласцях Беларусі і сакрэтнае пісьмо аб ваенна-палітычнай рабоце ў заходніх абласцях БССР. Перш за ўсё гэтыя пастановы кіраўніцтва Беларусі прадугледжвалі ўзмацненне кіруючай ролі партыйных арганізацый у кіраванні партызанскім рухам у Заходняй Беларусі. Разам са стварэннем падпольных партыйных камітэтаў і цэнтраў камуністычнай партыі ставілася задача стварэння ва ўсіх раёнах Заходняй Беларусі партызанскіх атрадаў. У Беластоцкую і Брэсцкую вобласці прадпісвалася перавесці з іншых абласцей Беларусі сорак партызанскіх атрадаў, г.зн. па адным у кожны раён. У адпаведнасці з гэтымі дакументамі савецкім фарміраванням быў пастаўлены абавязак падаўляць польскае падполле, АК, раззбройваць, нягледзячы на тое, што АК вяла антыфашысцкую барацьбу. Польскі эміграцыйны ўрад і падначаленае яму падполле прадстаўлялі сілы, якія менавіта супрацьстаялі ажыццяўленню курсу савецкага кіраўніцтва. Адной з першых супярэчнасцей была праблема будучай савецка-польскай мяжы. Адносіны паміж польскім эміграцыйным і савецкім урадамі ў ходзе вайны ўвесь час пагаршаліся. Урад Сікорскага, а пасля Мікалайчыка, выступалі за аднаўленне мяжы на 1 верасня 1939 года, а савецкі бок выступаў за новую мяжу па этнаграфічным крытэрыі, якая пасля прыняла за аснову лінію Керзана.

Пасля абнародавання катынскай справы польскі ўрад быў абвінавачаны ў супрацоўніцтве з гітлераўцамі і на аснове гэтага савецкае кіраўніцтва 25 красавіка 1943 года разарвала з ім дыпламатычныя адносіны. Такім чынам Сталін пазбавіўся ад такога нязручнага польскага саюзніка і ў выніку гэтага атрымаў значна большую свабоду па рэалізацыі сваіх геапалітычных задач. У ходзе выканання прынятых пастаноў ЦК КП(б)Б у 1943 годзе ішло стварэнне падпольных абласных, раённых, міжраённых партыйных органаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Летам 1943 года быў створаны Беластоцкі абласны камітэт на чале з сакратаром Васілём Самуціным. Адначасова ў 1943 годзе ішоў працэс утварэння раённых органаў партыі, а таксама камсамола. Аднак асваенне Беластоцкай вобласці складала найбольш складаную задачу для савецкага кіраўніцтва. З аднаго боку, як вядома, гітлераўскія акупанты ўключылі Беласток у склад Усходняй Прусіі і тэрыторыя была пакрыта густой

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Віталь Барабаш

сеткай гарнізонаў, узмоцненай карнымі падраздзяленнямі. Перыяд 1939-1941 гадоў сведчыў аб дамінаванні сярод польскага насельніцтва Беласточчыны непрыхільнага стаўлення да савецкай улады. Вядома, гэта была палітыка сталінскага рэжыму, дэпартацыі. Па прызнанні ўпаўнаважанага беларускага штаба партызанскага руху, на чэрвень 1943 года ў Беластоцкай вобласці партызанскіх атрадаў не было. Былі выяўлены дробныя, астаўшыяся ў акружэнні групы байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, былых партыйных савецкіх работнікаў і мясцовых членаў савецкага актыву. Гэтыя групы нікім не кіраваліся. У пачатку жніўня 1943 года сакратар Беластоцкага падпольнага абкома партыі В. Самуцін быў перакінуты з Масквы ў Слуцкую партызанскую зону, дзе разам з начальнікам штаба партызанскага руху Мінскай вобласці Піліпам Капустам прыступіў да фарміравання Беластоцкага злучэння. 1 верасня створанае злучэнне пачало рэйд з Мінскай у Беластоцкую вобласць. Усяго да зімы 1943-1944 гадоў у Заходнюю Беларусь было перакінута шаснаццаць буйных савецкіх фарміраванняў агульнай колькасцю каля васьмі тысяч байцоў. Гэта дазволіла стварыць значную перавагу сіл у параўнанні з АК на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Тут ідзе гаворка пра ўзброеныя партызанскія сілы. Тут налічвалася 185 усіх савецкіх партызанскіх атрадаў, меўшых у сваім складзе дваццаць пяць тысяч васемсот трыццаць пяць партызан. У асноўным гэтыя атрады занялі прадвызначаныя ім раёны дыслакацыі, за выключэннем вось менавіта гэтай жа Беластоцкай вобласці. Перш за ўсё пад націскам гітлераўскіх акупантаў Беластоцкае злучэнне, на чале з Беластоцкім абкамам, было вымушана спыніцца ў асноўнай сіле ў Ліпічанскай пушчы (між Мастамі і Дзятлавам — А. В.) у Баранавіцкай вобласці на мяжы ракі Нёман. Там жа сталі дыслацыравацца і раней утвораныя раённыя камітэты партыі і камсамола Беластоцкай вобласці, якія ў Беластоцкую вобласць не маглі пранікнуць.

28 лістапада 1943 года адбылося спецыяльнае пасяджэнне Беластоцкага абласнога камітэта, на якім былі прыняты задачы на зіму 1943-1944 гадоў. Паколькі мэта партызанскай дзейнасці ў рэгіёне не апраўдала сябе, бо амаль ніводнаму атраду не ўдалося пранікнуць у вызначаны рэгіён, прынята рашэнне аб правядзенні аперацыі выключна малымі групамі, перад якімі была пастаўлена задача канспіравання, а затым падгатоўка тэрыторыі да прыходу асноўных партызанскіх сіл — калі на гэта дазволіць ваеннае становішча. Аднак большасці груп не ўдалося прабіцца ў вызначаныя раёны і яны праз некалькі тыдняў вярнуліся ў свае базы. Няўдача аперацыі прымусіла партыйнае кіраўніцтва да чарговага змянення планаў. Было вырашана спыніць спробы пранікнення ў Беластоцкую вобласць да вясны 1944 года. Сур'ёзнай перашкодай для савецкіх антыфашыстаў у асваенні Беласточчыны было — апрача нямецкіх гарнізонаў — разгалінаванае польскае падполле. Колькасна Беластоцкая акруга АК лічылася адной з самых буйных у маштабе Арміі Краёвай на польскіх землях. У пачатку ліпеня 1944 года Беластоцкая акруга АК налічвала трыццаць тры з паловай тысячы канспіратыўных членаў. Узмацненне гітлераўскіх масавых рэпрэсій, мабілізацыя моладзі на работы ў 1943 годзе прымусілі многіх хавацца ў лясах. Каб стварыць умовы для выжывання і не дазволіць на страты тых людзей і ўступленне ў савецкія фарміраванні, камендант Беластоцкай акругі АК Уладыслаў Лінярскі 7 мая 1943 года выдаў загад арганізаваць поўныя партызанскія атрады. Адной з галоўных задач, пастаўленых у гэтым загадзе, было паступовае выцісканне з польскіх зямель савецкіх партызанаў. У становішчы кульмінацыі нацысцкага тэрору Лінярскі 30 ліпеня 1943 года аддаў загад, у якім прадпісвалася разам з падрыхтоўкай акцый адплаты супраць фашыстаў бязлітасна ліквідаваць усе асобы, якія пагражалі польскаму руху супраціўлення, уключаючы і камуністаў, і савецкіх партызанаў. Пазней, аднак, атрымаўшы ўказанне ад галоўнага каменданта АК, Лінярскі ў загадзе ад 1 красавіка 1944 года прадпісваў не праводзіць без ягонага дазволу ніякіх узброеных акцый супраць савецкіх партызанаў; недапушчальныя былі даносы на іх акупацыйным уладам, хаця да гэтай пары гэта мела месца з абодвух бакоў — і з савецкага боку, і з боку АК.

Акрамя Арміі Краёвай на тэрыторыі Беласточчыны савецкім антыфашыстам супрацьстаялі іншыя польскія падпольныя арганізацыі. Значнымі па сіле з'яўляліся ўзброеныя фарміраванні эндэцкай партыі — Нацыянальныя узброеныя сілы, колькасць якіх на Беласточчыне складала каля сямі тысяч салдат. А таксама Нацыянальная ваенная арганізацыя, якая налічвала каля чатырох тысяч членаў. Найбольшай падтрымкай эндэцыя карысталася сярод насельніцтва заходніх і паўднёвых раёнаў Беласточчыны. Радыкальныя фарміраванні адрозніваліся ад АК непрымірымасцю ў барацьбе з савецкімі партызанамі, а таксама ў праследаванні камуністаў і рускіх перш за ўсё. Больш таго, з мэтай супрацьстаяння савецкім партызанам у барацьбе за ўплыў на насельніцтва польскі эміграцыйны ўрад і падпарадкаванае яму падполле накіроўвалі з цэнтральнай Польшчы на тэрыторыю Заходняй Беларусі афіцэраў і прадстаўнікоў розных палітычных партый, нават узброеныя фарміраванні. Былі гэта ўдарныя кадравыя батальёны; яны вялі барацьбу як супраць фашыстаў, так і — асабліва на Беласточчыне — супраць савецкіх партызанаў і камуністаў.

Тым не менш на Беласточчыне не было такіх вострых канфліктаў у параўнанні з іншымі абласцямі Заходняй Беларусі. У справаздачы Самуціна аб баявой рабоце партызанскіх атрадаў у Беластоцкай вобласці з 1 студзеня па 1 мая 1944 года, паведамлялася, што з белапалякамі праведзена пяць баёў, у ходзе якіх забіта 24 і паранена 19 польскіх салдатаў і афіцэраў. Для параўнання: на тэрыторыі Баранавіцкай і Вілейскай абласцей, дзе польска-савецкі канфлікт быў найбольш жорсткі, там колькасць параненых і забітых складала некалькі соцень чалавек. На Беласточчыне савецкія партызаны не здолелі арганізаваць буйных баз і не мелі дастатковых сіл для задушэння польскага супраціўлення. І гэта было адной з прычын адсутнасці тут такіх жорсткіх канфліктаў. Канфлікты былі, але не ў такім маштабе. Былі спробы ўстанавіць супрацоўніцтва ў 1943 годзе, вясной 1944 года прадстаўнікі Арміі Краёвай прапанавалі савецкім антыфашыстам стварыць такую буйную зону з агульным штабам для барацьбы супраць гітлераўцаў. Іншыя прапановы сумесных дзеянняў на Беласточчыне былі з савецкага боку, аднак перамовы ў большасці не мелі поспеху, паколькі АК разглядала Беласточчыну як польскую тэрыторыю, таму з яе боку былі прапановы, каб савецкія партызаны падпарадкоўваліся Арміі Краёвай, на што савецкія партызаны не маглі пагадзіцца. Нягледзячы на розныя палітычныя рознагалоссі і лакальныя канфлікты, паміж польскімі і савецкімі атрадамі на Беласточчыне дамінава-

працяг ☞9

Беларуская гісторыя і нацыянальнасць

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Сустрэча з прафесарам Алегам Латышонкам, наладжаная 15 кастрычніка ў Музеі і асяродку беларускай культуры, была добрай нагодай для размовы не толькі аб беларускай гісторыі, але і для гутаркі пра беларускія нацыянальныя справы. Алег Латышонак быў запрошаны ў Гайнаўку на дыскусію аб ягонай новай кніжцы „Нацыянальнасць — беларус", якая публічна прэзентавалася ўжо ў Беларусі.

Спачатку прафесар Алег Латышонак расказаў пра кніжку „Жаўнеры БНР", падрыхтаваную раней на аснове яго доктарскай дысертацыі, але намнога больш увагі адвёў новаму выданню „Нацыянальнасць — беларус".

— Калі я пісаў уступ да сваёй доктарскай дысертацыі, хацеў расказаць адкуль узялася назва „Беларусь". Шукаючы адказу на гэтае пытанне, сабраў я многа матэрыялаў і заўважыў, што ў іх няма ні складу, ні ладу. Зараз у Беларусі існуе нават перакананне, што гэтую назву навязала нам Кацярына II, а ў больш навуковым асяроддзі лічыцца, што назву „Беларусь" прыдумалі цар Аляксей Міхайлавіч або цар Іван Грозны. Аднак я знаходзіў самыя даўнія названні „Белая Русь", пісаныя лацінскім шрыфтам і на заходніх мовах. Першае такое названне я знайшоў у крыніцах XIII стагоддзя, а ўжо часцей гэтая назва выступае ў XVI стагоддзі. Паводле знойдзеных мною матэрыялаў першым уладаром, які карыстаўся назвай „Белая Русь", быў кароль Венгрыі і Польшчы Людвік Венгерскі. Тлумачэнне „Белая Русь" з венгерскага абазначае „магутны" і „высакародны", — сказаў прафесар Алег Латышонак. — У XVI стагоддзі палякі ўсё, што на ўсход ад Галіччыны, лічылі Белай Руссю. Я думаю, што нашы продкі менавіта ад палякаў пераняли названне „Белая Русь", якое паяўляецца ў запісах з другой паловы XVI стагоддзя. Калі Стэфан Баторый адваяваў ад Івана Грознага Полацк, тады пісалася, што Полацк і Орша знаходзяцца ў Белай Русі і гэтай назвай палякі карысталіся да канца Рэчы Паспалітай. У вайсковыя і касцельныя назвы уводзілася слова „беларускі". Напрыклад, у адносінах да структур Каталіцкага касцёла пісалася „Беларускі епіскапат", да Праваслаўнай царквы — „Беларуская епархія", да Пратэстанцкага касцёла— „Беларускі дыстрыкт", а ў адносінах да вайсковых часцей — „Беларуская дывізія". Калі нашы землі былі далучаны да Расіі, было таксама перанята і названне „Беларусь". Намі гэтая назва была прынята самастойна, а ва ўсіх індаеўрапейскіх мовах слова „белы" абазначае толькі самыя станоўчыя рысы — чысціню, магутнасць, высакароднасць.

Паводле прафесара Алега Латышонка, першым чалавекам, які публічна стаў называць сябе беларусам, паступаючы ў 1586 годзе ва Універсітэт у Альтдорфе, можна лічыць пратэстанта Саламона Рысінскага, які выводзіўся з Полаччыны, а нарадзіўся пад Віцебскам, зразумела, калі не знойдзецца ранейшых запісаў пра асобы, якія назвалі сябе беларусамі. Тады ў пратэстантаў была мода даваць біблейскія імёны і адтуль імя Саламон.

— Усе нашы сённяшнія нацыянальныя хваробы вынікаюць з даволі маладога ўзросту нашай нацыі, а сам працэс фарміравання нашай дзяржаўнасці таксама быў кароткім. Калі Вацлаў Ластоўскі ў 1917 годзе напісаў, што Беларусь павінна існаваць як самастойная дзяржава, то ўжо ў 1991 годзе Беларусь стала незалежнай дзяржавай. Іншыя нацыі мусілі стагоддзямі змагацца за сваю самастойнасць. Мая бабуля, якая нарадзілася ў 1906 годзе, ведала Станіслава Балаховіча і па тэлебачанні мела нагоду пабачыць прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку. Фактычна пры жыцці аднаго чалавека стварылася наша дзяржаўнасць, — сказаў гісторык Алег Латышонак.

Прэзентуючы ў Рэспубліцы Беларусь кніжку „Нацыянальнасць — беларус" яе аўтар сустрэўся ў асноўным са станоўчай ацэнкай свайго выдання тамашнімі беларусамі. Аднак паяўляліся таксама і крытычныя выказванні, асабліва ананімныя каментарыі ў інтэрнэце.

— Без змястоўнай дыскусіі, а ў гэтым ліку і крытычных ацэнак, няма прагрэсу ў гістарычных пошуках, — заявіў спадар Латышонак. — Для мяне самае важнае тое, што ў гісторыі сапраўды адбылося, і намаганні супраць фальшавання гісторыі. Калі нацыя ведае гісторыю ў фальшывым варыянце, наступае на граблі, і я хацеў бы, каб такога беларусы пазбеглі.

Адказваючы на пытанні сабраных, госць сустрэчы звярнуў увагу на свае пошукі матэрыялаў у архівах Еўропы і Амерыкі, напрыклад, у Інстытуце Пілсудскага ў Нью-Йорку, у архівах Масквы ці Пецярбурга.

— Я рос у сямідзесятых гадах, калі ў Польшчы нельга было выдаваць кніжак ні пра беларусаў, ні пра украінцаў. Знаходзіў я тады толькі параскіданыя паасобныя звесткі па гісторыі Беларусі і мяне цікавілі пошукі большай колькасці інфармацыі. Калі я стаў збіраць гістарычныя матэрыялы да сваіх кніжак, архівы былі ўжо адкрытымі. Можа нават большы доступ да архіўных матэрыялаў быў у Расіі, чым у Польшчы, дзе апрача тайных спраў можна было ўсё шукаць. Пасля можна было назіраць абмежаванне доступу да архіўных матэрыялаў у Польшчы, а зараз можа і ў Расіі абмяжоўваецца доступ да архіваў, — заявіў Алег Латышонак, звяртаючы ўвагу на патрэбу ўсебаковага даследавання гісторыі Беларусі.

У час спаткання паявілася таксама пытанне наконт цяперашняй навуковай працы прафесара Алега Латышонка.

— Я зараз стаў займацца роляй вікінгаў у гісторыі Беларусі і даследую, між іншым, хто з вікінгаў заваяваў Полацк у IX стагоддзі. Можа мая полацкая кроў адазвалася ўва мне, бо мой бацька выводзіцца з Полаччыны. Планую заняцца таксама даследаваннем беларуска-латышскіх узаемаадносін. Праз 2-3 тыдні выйдзе „Гісторыя Беларусі" ад паловы XVIII стагоддзя да нашых дзён, дзе я разам з Яўгенам Мірановічам з'яўляюся сааўтарам выдання, — паінфармаваў прафесар Алег Латышонак.

Госць распавядаў таксама пра цяжкасці, якія прытарможваюць даследаванні беларускіх гісторыкаў у Польшчы.

— Зараз у нас у Гістарычным таварыстве ёсць толькі 3 прафесары і не хапае кадраў, каб можна было інстытуцыянальна заняцца даследаваннем гісторыі. Бяда ў нас, што няма маладых гісторыкаў, якія маглі б нас падмяніць. Калі мне ўжо за 50 гадоў, то можна мяне лічыць старым гісторыкам. Раней многа нашых хлопцаў выбрала гістарычны напрамак вышэйшай адукацыі, а цяпер зацікаўленне гістарычнай адукацыяй сярод нашай моладзі невялікае. Наша Царква таксама не стварае ніякага нацыянальнага асяроддзя. Была магчымасць стварыць Інстытут беларусазнаўства ў Беластоку і нават было ўсё падрыхтаванае, але пастановы былі адхілены, дакументы схаваныя. У гэтым інстытуце маглі б працаваць гісторыкі, якія даследавалі б нашае мінулае, бо планавалася прыняць там на працу чалавек 30, — паведаміў прафесар Латышонак, звяртаючы ўвагу, што ініцыятыва не была адпаведным чынам падтрымана нашай грамадскасцю, не было пратэстаў у час, калі былі спынены працы па стварэнні Інстытута беларусазнаўства.

8 ☞ працяг

ла ўзаемная талерантнасць. Нярэдка даходзіла і да супрацоўніцтва, напрыклад, у Аўгустоўскіх лясах, дзе было падпісана пагадненне і яго бакі ў асноўным прытрымліваліся. Аднак значны ўзаемны недавер усё ж такі быў.

Трэба тут сказаць і аб пазіцыі мясцовага насельніцтва Беласточчыны, а быў гэта фактар, які таксама значна стрымліваў дзейнасць савецкіх партызанаў. З аднаго боку выяўляўся вопыт 1939-1941 гадоў, а з другога боку дзейнасць савецкіх партызанаў, калі былі рабункі мясцовага насельніцтва, якія настройвалі насельніцтва супраць савецкіх падпольшчыкаў. Вось у дакладной запісцы на імя Панцеляймона Панамарэнкі Беластоцкі абкам 1 студзеня 1944 года паведамляў, што можна беспамылкова заключыць пра тое, што 70% вёсак, дзе дамінуе польскае насельніцтва, у той ці іншай ступені ахоплена падпольнымі нацыяналістычнымі польскімі арганізацыямі. Часта менавіта такую варожасць да савецкіх партызанаў выкарыстоўвалі і немцы, калі савецкія атрады не вялі барацьбы, а займаліся грабяжом мясцовага насельніцтва. Таму вось насельніцтва было нярэдка вымушана звяртацца да нямецкіх улад і ствараліся ўзброеныя вёскі з самааховай. Вясной 1944 года асабліва многа такіх вёсак было з усходу і поўдня Беластока, яны быццам акружалі горад. Становішча савецкіх партызанаў аставалася складаным нават з момантам вызвалення Беласточчыны ў ліпені 1944 года. І тут у выніку такой напружанай працы толькі некаторыя групы здолелі пранікнуць да лета 1944 года ў дальнія раёны Беласточчыны. І далей ужо барацьба супраць польскага падполля працягвалася пасля вызвалення Чырвонай Арміяй буйнамаштабнымі органамі НКУС.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі тылы Арміі Краёвай падтрымлівала перш за ўсё польскае насельніцтва, у 80% былі гэта мясцовыя сяляне. Аднак не толькі палякі былі ў Арміі Краёвай, напрыклад у Навагрудскай акрузе АК, адной з буйнейшых, у некаторых атрадах 30-40% складалі праваслаўныя беларусы. Відаць, што і частка беларусаў падтрымлівала Армію Краёву. Гэтаму прычыніўся ўсё ж такі савецкі вопыт 1939-1941 гадоў. Спачатку яны сустракалі савецкую ўладу, але пасля пабачылі той сталінскі рэжым, таму некаторыя пачалі падтрымліваць Армію Краёву і выступаць за аднаўленне Польшчы. На Беласточчыне ў АК уваходзілі ў асноўным палякі, бо тут было больш аднароднае насельніцтва, дзе пераважалі палякі, не так перамешанае як на Навагрудчыне.

Быў загад прымаць у АК толькі палякаў і на тэрыторыі Польшчы прытрымліваліся гэтага загаду. Але на ўсход ад Беласточчыны, дзе пражывала перамешанае насельніцтва, гэтага загаду было вельмі цяжка прытрымлівацца. Таму самі каменданты АК, у Навагрудскай акрузе ці Віленскай, таго загаду не выконвалі, таму пад іх камандаваннем апынулася і такая значная маса беларусаў. Яўрэяў у асноўным не бралі ў АК, а прычынай таму былі падзеі 1939-1941 гадоў, калі яўрэі актыўна сустрэлі савецкую ўладу і часта выступалі супраць былой польскай дзяржавы.

Бывала прымусовая мабілізацыя насельніцтва ў партызанскія атрады, так у польскія, як і савецкія. У параўнанні з савецкімі партызанамі ў АК заўсёды была праблема недахопу ўзбраення. Савецкія партызаны атрымлівалі забеспячэнне з Вялікай зямлі. Калі ж ідзе пра АК, то скіданне ўзбраення адбывалася ў цэнтральнай Польшчы, на тэрыторыю Заходняй Беларусі не скідалі і тут узбраенне можна было набыць шляхам збройных акцый, былі астаткі польскага ўзбраення з 1939 года. Каменданты акруг заўсёды скардзіліся, што дабравольцаў у партызаны многа, але немагчыма іх прыняць з-за недахопу ўзбраення. Мабілізацыя ў АК праводзілася там, дзе было супрацоўніцтва АК з немцамі. Яно пачынаецца з 1943 года раззбраеннем савецкімі партызанамі атрадаў АК. Таму некаторыя з іх фарміраванняў, напрыклад у Навагрудскай акрузе, пайшлі на супрацоўніцтва з немцамі, і немцы пастаўлялі ім зброю. А калі ў іх была зброя, то маглі і праводзіць мабілізацыю; гэта мела месца асабліва на Лідчыне.

Апрацаваў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

„Скарб” з Палесся

Культурны цэнтр Беларусі ў Беластоку, Згуртаванне Музей малой айчыны ў Студзіводах і Ваяводскі асяродак анімацыі культуры запрасілі 12 кастрычніка г.г. у выставачную залу ў цэнтры ВААК „Сподкі” (вул. Св. Роха, 14) у Беластоку. Экспазіцыя „Вандроўка па Палессі” каля 300 прац 29 майстроў народнай творчасці, членаў Берасцейскага абласнога клуба народных майстроў „Скарб” з'яўляецца перасоўнай выстаўкай, у Польшчы яна ўвайшла ў праграму міжнароднага фестывалю аўтэнтычнага фальклору „Там по маёвуй росі”, ладжанага Музеем малой айчыны. Сярод творцаў — вядомыя ганчары Васіль Логвін, Арсень Шэлест, Аўрам Басавец, керамісты Наталля Крывіцкая, Валеры Марчук, Павел Рабаў, разьбяры Уладзімір Чыквін, Іван Супрунчык, Мікалай Тарасюк, Аляксандр Лазерка, Валеры Манцэвіч, Анатоль Туркоў, Сяргей Юркевіч, Ірына Кушнярук, ткачы — Надзея Грыцук, Ганна Дзмітрук, Марыя Краўчынская, Ларыса Мешчанчук, Людміла Шастакоўская, Люба Шумская, Вера Бурачэўская, Ніна Казак, майстры саломапляцення Юлія Піваварава, выцінанкі — Ніна Міхайлава, пісанкі — Марына Марчук, вышыўкі — Валянціна Саўчук, роспісу на шкле — Марыя Кулецкая.

— Выстаўка перасоўная, у Беларусі была паказана ў 12 раёнах вобласці, — расказвае Ларыса Быцко, загадчыца аддзела традыцыйнай культуры Берасцейскага абласнога грамадска-культурнага цэнтра. — У Польшчы паказаліся мы ў Гайнаўцы і Бельску-Падляшскім. Наша выстаўка гэта своеасаблівае падарожжа па Заходнім Палессі, у якім спадарожнічаюць нам найлепшыя народныя творцы гэтай цудоўнай краіны. Калі спынімся пры драўляных фігурках Мікалая Тарасюка са Стойлаў каля Пружан, адразу трапляем у палескую вёску, дзе мясцовыя людзі жывуць згодна з адвечнымі законамі. У гэтых драўляных людзей — як іх называе майстар — усё як у сапраўдных. Праца і святкаванне, гора і радасць, вяселле і мярліны — усё побач сябе, як у жыцці, паказана шчыра і з любоўю. Гэтую ўсю энцыклапедыю вясковага жыцця стварыў майстар з драўніны, вярбы і саломы. Для гэтай незвычайнай краіны Мікалай Тарасюк збудаваў на сваім падворку спецыяльны музей і назваў яго „Успаміны Бацькаўшчыны”. Іншы майстар — Іван Супрунчык з вёскі Цярэбліч (ён разьбяр, жывапісец і графік) свае скульптуры выканаў сякерай. На выставе прадставіў ён абрады — Дзяды, „Даспела”, вясельны „На дзяжу”, Каляды. У роднай вёсцы стварыў этнаграфічны музей. Вучыць, якім важным з'яўляецца пашана для продкаў, чэрпанне з іхняга досведу, працяг повязі пакаленняў. Іван Супрунчык з'яўляецца адной з найвыдатнейшых творчых постацей Берасцейшчыны. Уладзімір Чыквін з Кобрына (яго род выводзіцца з падчаромхаўскіх Хлевішчаў) даследуе і калекцыянуе традыцыйныя формы драўлянага посуду, якім карысталіся нашы продкі і сам робіць здобнае начынне. У краіне і за мяжой вядзе аўтарскія майстар-класы „Беларуская лыжка”.

Ткачыха Мікалая Тарасюка

Моцныя роднай песняй Святлана, Ала і Валя Лук'яновіч ды Сцяпан Копа

У працах берасцейскіх аўтараў відаць шчырую любоў да малой айчыны. Анатоль Туркоў з Камянца паказаў трыпціх у гравюры на дрэве „Белавежская пушча”. Ірына Кушнярук з прыпушчанскіх Каменюкоў — тры працы, м.інш. „Царскі палац у Белавежы”. На Камянеччыне захавалася ўнікальнае падвойнае ткацтва. Надзея Грыцук, Ганна Дзмітрук, Марыя Краўчынская і Люба Шумская паміж традыцыйныя ўзоры ўплятаюць свае сучасныя мроі. Сяргей Юркевіч з Бярозы аздобіў выстаўку птушкамі з лучыны. Вельмі цікава вылучаецца кераміка з Гароднай каля Століна — там ёсць адзіны функцыянуючы цэнтр традыцыйнага ганчарства, якое расславіла вёску ад Вільні па Валынь і аж да Варшавы. Цяпер ужо не сотні там ганчароў, як ад 15 стагоддзя, а 11, а сярод іх — Аўрам Басавец і Арсень Шэлест, лаўрэаты шматлікіх конкурсаў. Сучаснае ганчарства рэкамендуюць Васіль Логвін (чорная кераміка), Павел Рабаў, майстры з Брэста Наталля Крывіцкая і Валеры Марчук. Традыцыйныя гліняныя цацкі выканаў Васіль Савіч з Багданаўкі Лунінецкага раёна...

Ларыса Быцко (першая злева) прывезла найлепшае народнае мастацтва. На сцяне — камянецкія пераборныя тканіны

Адрыццё выстаўкі аздобілі спявачкі сёстры Святлана, Ала і Валянціна Лук'яновічанкі з Леснікоў Драгічынскага раёна, якія геніяльна аднаўляюць старадаўнія песні роднай стронкі.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Цяжка знайсці ў свеце чалавека, які б ніколі не чуў пра такую краіну як Кітай. Гэта ўвогуле падаецца немагчымым, калі ўявіць, што амаль кожны шосты на нашай планеце — гэта кітаец. Ну а калі звярнуць увагу на месца вытворчасці тых шматлікіх прадметаў, якімі мы штодзень карыстаемся, то можа з'явіцца ўражанне, што Кітай ужо стаў ледзь не цэнтрам сусветнай цывілізацыі, яго зборачным цэхам. З таго вынікае, што ведаем мы пра гэтую краіну дастаткова. Праўда, дагэтуль не было той крыніцы, якая б даносіла звесткі пра Паднябесную на беларускай мове.

Апошнім часам сітуацыя карэнным чынам змянілася — Міжнароднае радыё Кітая (МРК) займела старонку ў інтэрнэце, дзе пра Кітай распавядаецца па-беларуску. Месціцца яна па адрасе http://belarusian.cri.cn/.

Першы позірк на галоўную старонку адразу выхоплівае яе ўсходнюю стракатасць. Воку цяжка засяродзіцца на чымсьці адным — нават назва сайта „CRI Online”, нягледзячы, што знаходзіцца ўверсе выяўлення, уяўляецца недзе на другім плане.

Што ж тычыцца інфармацыйнага напаўнення сайта, то такую насычанасць не часта сустрэнеш, блукаючы па Байнэце. І гэта пры тым, што нічога новага ў падачы інфармацыі кітайскія аўтары партала не знайшлі — выяўленне старонкі падзяляецца на тры традыцыйныя часткі, маецца фотагалерэя, прагноз надвор'я, курсы валют, месца для адказаў на прапанаваныя пытанні.

Выйсці на галоўныя рубрыкі сайта месцяцца толькі зверху выяўлення. На першы погляд іх не надта многа, але гэта памылковае ўражанне. Практычна кожны сказ альбо загаловак нататкі на галоўнай старонцы вядзе да асобна створанага выяўлення, дзе змяшчаецца поўная версія артыкула.

З'яўленне беларускамоўнага сайта кітайскага радыё стала падзеяй для беларускай медыйнай прасторы. Тым больш, што данае радыё — адзінае дзяржаўнае радыё ў Кітаі, якое вяшчае на іншыя краіны.

19 кастрычніка на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік галоўнага рэдактара МРК Інь Лі заявіў, што інтэрнэт-старонка радыё на беларускай мове з'яўляецца „акном для знаёмства беларусаў з Кітаем”.

А пазнаёміцца сапраўды ёсць з чым. Напрыклад, з артыкулам „Свята Цынмін і пахавальны абрад”, які будзе своечасовым напярэдадні свята „Усіх святых”. З артыкула мы даведаемся, што капаюць магілу для памерлага ў Кітаі толькі нацыянальныя меншасці, якія вызнаюць іслам — усе іншыя спальваюць і развейваюць попел над морам альбо закапваюць пад дрэвам.

Праўда, найбольш уражвае наступная інфармацыя. „Па меры ўкаранення ў нашае жыццё камп'ютарнай тэхнікі ў гарадах Кітая сталі з'яўляцца так званыя сеткавыя могілкі, мемарыяльныя музеі і калумбарыі”, — распавядаецца ў артыкуле.

Далей распавядаецца аб могілках на ўскрайку Пекіна, дзе ішла цырымонія адкрыцця сеткавага могільніка: „На плошчы стаялі ў шэрагу камп'ютары. Родныя і блізкія 20 памерлых стварылі ў інтэрнэце вэб-сайты, якія, па сутнасці, уяўляюць сабой мемарыяльныя музеі з фатаграфіямі, біяграфіямі і жалобнымі прамовамі ў памяць аб памерлых. Зараз можна ў любы час увайсці ў камп'ютарную сетку і наведаць музей, каб аддацца ўспамінам, паднесці памерлым кветкі альбо любімыя песні”.

На сайце радыё можна нават вучыцца кітайскай мове. Праўда, мовай навучання чамусьці з'яўляецца руская.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Першая вікторыя БАТЭ

Барысаўскі БАТЭ дасягнуў першай вікторыі ў футбольнай Лізе Еўропы, а самая стадыя групавога турніру дасягнула стадыі экватара. На полі мінскага стадыёна „Дынама” падначаленыя Віктара Ганчарэнкі адолелі грэчаскі АЕК з Афінаў — 2:1. Матч складваўся вельмі няпроста. У першым тайме госці з пенальці, прызначанага з-за фолу Сяргея Сасноўскага, адкрылі лік на 31-й хвіліне. На пачатку другой паловы сустрэчы барысаўцы пасля зацяжной атакі параўнялі лічбы на табло — вызначыўся Аляксандр Паўлаў, які ўдала паспеў на дабіванне. А на 85-й хвіліне выйшаўшы на замену Аляксандр Алумона забіў мяч галавой і прынёс перамогу БАТЭ. Трэба заўважыць, што амаль увесь другі тайм АЕК з-за выдалення футбаліста гуляў у меншасці, а ў канцоўцы ўвогуле ўдзевяцёх. Наступны матч, які адбудзецца паміж гэтымі клубамі 5 лістапада з-за дыскваліфікацыі будуць прапускаць абодва цэнтральныя абаронцы АЕК, а яшчэ пару гульцоў грэчаскай каманды атрымалі траўмы на цяжкім падчас непагадзі полі. Гэта істотна падвышае шанцы барысаўцаў на чужой арэне. З іншага боку, у Грэцыі заўсёды цяжка гуляць прыехаўшым камандам, незалежна ад іх класа. Да гэтага варта дадаць, што АЕК застаўся вельмі незадаволены судзействам, хоць арбітраж быў дастаткова справядлівым. Ды БАТЭ ўжо зведаў „першую кроў” і будзе выдатна, калі зможа прэтэндаваць на нешта большае, чым адна вікторыя ў турніры. У гэтым жа туры ў групе „І” лісабонская „Бенфіка” нечакана разграміла ліверпульскі „Эвертан” — 5:0. Што здарылася з брытанцамі ў гэты дзень, сказаць цяжка. Такім чынам становішча ў квартэце зараз наступнае: „Бенфіка” і „Эвертан” маюць па 6 ачкоў, а БАТЭ і АЕК — па 3.

Нацыянальны чэмпіянат тым часам выйшаў на фінішны адрэзак. БАТЭ датэрмінова ўпэўнена заваяваў тытул, а вось нервы пераважнай бальшыні камандаў напружаныя да апошняга. У мінулыя выходныя прайшлі матчы 24 тура, кожны з якіх вырашаў нешта важнае. Гродзенскі „Нёман” прымаў на сваім полі салігорскі „Шахцёр” і ў няпростым паядынку здабыў вікторыю 2:1. У брэсцкім абласным дэрбі сустрэліся „Дынама” і мікашэвіцкі „Граніт”. Перамаглі прадстаўнікі абласнога цэнтра — 3:1. Іншыя гульні завяршыліся так: „Смаргонь” — „Гомель” — 1:1, ФК „Мінск” — „Днепр” (Магілёў) — 2:1, „Віцебск” — „Нафтан” (Наваполацк) — 1:0 , БАТЭ — МТЗ РІПА (Мінск) — 2:2, „Дынама” (Мінск) — „Тарпеда” (Жодзіна) — 0:0. Такім чынам за два туры да заканчэння першынства вызначыўся і сярэбраны прызёр — ім стала мінскае „Дынама”, якое ўжо ніхто не дагоніць, а таксама яшчэ адна каманда, якая пакідае вышэйшую лігу — гэта „Граніт”. Заўважым, што ў апошніх турах зыходы матчаў стала прагназаваць надзвычай цяжка, бо каманды з ніжняй часткі табліцы даюць „апошні бой” прэтэндэнтам на ўзнагароды. Трэба пахваліць футбалістаў „Смаргоні”, якія нават, развітаўшыся з элітай, не раздаюць іншым ачкоў, а змагаюцца ў кожнай сустрэчы. На бронзу цяпер рэальна прэтэндуе ажно пяць клубаў („Днепр”, „Тарпеда”, „Нафтан”, брэсцкае „Дынама” і „Шахцёр”), а рэшта — таксама 5 калектываў — стаяць пад пагрозай развітання з мацнейшым дывізіёнам. У іх ліку і гродзенскі „Нёман”, які з 31 ачком ідзе пакуль на 9-м месцы. Хто б мог падумаць, што нёманцы, якія цягам турніру стаялі нават на другой пазіцыі, будуць такім чынам завяршаць першынство.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Паветра Вольнасці

Тэкст і фота
Віктара САЗОНАВА

Ля знака „Памежная зона”, 25 кастрычніка ў нядзелю, аўтакалона з аўтобуса, бусікаў і больш за дзесятак легкавікоў спынілася. Людзі выйшлі, і далей, да Якушоўкі, дзе ўсталяваны памятны крыж у гонар паўстанцаў 1863-64 гадоў, пайшлі пешшу.

Гэта ўжо чатырнаццаты год, калі патрыёты з усяе Беларусі збіраюцца на Гарадзеншчыне, на Свіслацкай зямлі, каб ля магілы Віктара Каліноўскага ўшанаваць памяць палеглых за Незалежнасць Бацькаўшчыны. Раней знака „Памежная зона” тут не было. А вось цяпер з’явіўся. Хіба для таго, каб нельга было даехаць да крыжа ў Якушоўцы. Але гэта не спыніла патрыётаў. Яны дайшлі пешшу.

— Я вельмі шчаслівы тым, што зараз бачу тут пэўна трыццаць адсоткаў новых людзей. Людзей маладых. І гэта надае ўпэўненасці, што наша Беларуская Адраджэнская справа не загіне, — заявіў ва ўступным слове старшыня гарадзенскага аргкамітэта сёлетняй імпрэзы, сябра Цэнтральнай Рады БСДГ Уладзімір Хільмановіч.

Як заўсёды лунае нацыянальная сімволіка. Грыміць „Жыве Беларусь”. Усе едуць у Свіслач. Белчырвона-белыя кветкі кладуцца ля помнікаў Кастусю Каліноўскаму і Рамуальду Траўгуту. Велічна гараць знічкі.

— Гэтае паўстанне не толькі наша гісторыя, але і наш лёс, — сказаў у сваім выступе Вячаслаў Сіўчык. — А лёс выпадковых людзей не ўздымае. Таму можна сказаць, што гэтая гісторыя наканавана нам лёсам. Не было б Каліноўскага, то не было б нічога. Ні Купалы, ні Коласа, ні Незалежнасці...

— Мы будзем вернымі іх памяці, — заяўлялі ў сваіх выступах старшыня партыі БНФ Аляксей Януковіч, кіраўнік абласной арганізацыі АГП Юры Істомін, адзін з пачынальнікаў гэтай акцыі, аўтар каванага памятнага крыжа Юрась Мацко, старшыня гарадзенскіх БХДоўцаў Алесь Кіркевіч, мясцовы арганізатар, кіраўнік свіслацкіх БНФаўцаў Анатоль Валюк.

Міліцыя прысутнічала ўвесь час. І пры пасадцы ў аўтобус у Гародні ўдзельнікаў папярэджвалі пра тое, што акцыя не санкцыяваная. І ў самой Свіслачы. Але правядзенню акцыі не перашкаджалі. Проста сачылі за парадкам і слухалі прамовы.

Завяршылася акцыя, як заўсёды, у лесе, дзе лунала нацыянальная сімволіка і партрэт Кастуся. Гарэла вогнішча, раздавалася беластоцкая „Ніва” і іншыя беларускамоўныя выданні, прапагандавалася адзіная на сёння незалежная беларуская ФМ станцыя „Радыё Рацыя”.

Там, у лесе, пад бардаўскія песні Валерыя Жамойціна і спевы моладзі прысутныя маглі падыхаць тым лясным паветрам Вольнасці, якім некалі дыхалі мужныя і вольналюбівыя, адважныя паўстанцы Кастуся Каліноўскага.

Фольгавая праблема

Статыстыка паказвае, што кожны дзень каля паўтара мільёна штук фольгавай упакоўкі трапляе на сметніцы. Фольгавы пакет, на думку эколагаў, „жыве” адно дванаццаць мінут, затым становіцца непрыдатным. Экалагічныя арганізацыі сігналяць на трывогу: ад забруджання асяроддзя штогод гінуць 143 віды жывёл. Праблема добравядомая прэм’ер-міністру, але нельга яе вырашыць, паколькі адсутнічае належная сістэма ў гаспадарцы адкідамі. Гандляры рэкамендуюць часова ўвесці пакеты шматразовага карыстання. Па-мойму, многае залежыць ад лакальнай грамадскасці. Гэта мы перш за ўсё павінны дбаць пра акружаючае нас наваколле.

(УС)

ЗАПРАШЭННЕ

Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь, Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча, Цэнтр праваслаўнай культуры ў Беластоку і Беларускае гарамадска-культурнае таварыства ў Польшчы

запрашаюць на

ЧАЦВЁРТЫ ВЕЧАР БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

які адбудзецца
6 лістапада 2009 года
а 18-й гадзіне ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку (вул. Св. Мікалая, 5).

У **праграме:** * прэзентацыя перавыдадзенага святога „Слуцкага Евангелля” * выступленне калектываў Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Беларускага Экзархата **„Сунічка”** і **„Скавыш”** * адкрыццё выставы іканапісца Віктара Доўнара (Мінск, майстэрня „Іконік”) * выступленне праваслаўнага мужчынскага ансамбля **„Благавест”** Выдавецтва Беларускага Экзархата * выстава-продаж кніг праваслаўных выдавецтваў Беларусі і Польшчы, а таксама царкоўнай утвары.

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — кітайскую прыказку.

1. травяністая расліна з поўдня Азіі, з валакна якой вырабляюць грубую тканіну і канаты = 6 _ 14 _ 13 _ 2 _;

2. гарэлка прыпраўленая ядлаўцовымі ягадамі = 23 _ 24 _ 15 _ 16 _;

3. негусты аўсяны кісель = 22 _ 33 _ 4 _;

4. гай, пушча, бор = 28 _ 17 _ 27 _;

5. страсць; у мастацтве твор з пакутным евангельскім сюжэтам = 25 _ 26 _ 1 _ 35 _ 29 _;

6. вялікая афрыканская пустыня = 32 _ 11 _ 34 _ 31 _ 7 _ 3 _;

7. крохкі сплаў жалеза з вуглародам = 12 _ 5 _ 9 _ 8 _ 10 _;

8. вершнік або фурман = 18 _ 30 _ 20 _ 21 _ 19 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 39 нумара

Самазвал, Хам, торба, дэкрэт, Ной, санет, аер, Жэнева, Аранхуэс, Рузвельт, смерд, опера.

Рашэнне: **Хто дрэнна слухае, той дрэнна разумее.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 180 egz.

Фота і тэкст
Ганны КАНДРАЦЮК

У Мастаўлянах усе нараджаліся маленькімі (10)

(пачатак у 33 н-ры)

У час апошняй вандроўкі ў Мастаўляны мясцовыя накіравалі мяне да самага заядлага крытыка Каліноўскага ў наваколлі.

— Няма тут пра што гаварыць, — адказаў на прывітанне спадар Ляўкоўскі. Пасля дадаў: — Каліноўскі з Мастаўлянамі не мае нічога супольнага!

Цікава, ён нарадзіўся тут у 1838 годзе. Быў хрышчаны два разы ў рыма-каталіцкім абрадзе ў Ялоўцы. Пражыў у Мастаўлягнах першыя 11 гадоў. Тут памерлі яго маці, браты і сёстры. Бацька меў ткацкую фабрыку.

— Не, — запярэчыў старажыл, — усё гэта байкі.

У беларускай вёсцы, каб не дастаць па галаве, заўсёды ідэйныя праблемы выпіхалі па-за межы сваёй мясцовасці, або за рэчку (дзе заўсёды чужая старана). Паводле спадара Ляўкоўскага, Каліноўскі не мог нарадзіцца ў Мастаўлянах, толькі на Барцоўскім выгане — на хутары за рэчкай. Зараз там Рэспубліка Беларусь, таму гэты паўстанец нічога супольнага з Мастаўлянамі не мае. Канец і кропка!

Але я не па тое ішла сюды 12 кіламетраў пешшу, каб закончыць размову ў самым гарачым месцы. Праўда, пакуль пачую самую модную версію пра Каліноўскага, мне прыйдзецца выслухаць нараканні на мізэрную цану шкураў і воўны, пра бесперспектыўнасць земляроба ў наш час і залатыя магчымасці пры народнай уладзе. Пры тым, увесь капітал, як і ў часы Каліноўскага, быў пералічаны на беларускую мужыцкую мерку: колькасць цэнтнераў пшаніцы.

* * *

У пачатку вёскі мяне правучылі, каб не асвятляць Каліноўскага і, як на смех, накіравалі да самага заядлага крытыка іх ураджэнца. Асвятляць чырвонага рэвалюцыянера вачыма яго аднавяскоўцаў было страшна і смешна. Так ці інакш пашанцавала мне ў адным — асветліць стан адукацыі ў нашых гмінах. Апошня заўвага накіравана да культурных і асветных устаноў у славутых гмінах Гарадок і Міхалова.

Паводле спадара Ляўкоўскага, з Каліноўскімі было так:

Іх бацька быў беззямельны, за што цар яго ўзнагародзіў і даў кавалак зямлі на Барцоўскім выгане. Там ён меў фабрыку. У бацькі былі два сыны: адзін быў Кастусь, а другі Вінцэнты. Той Кастусь то пазбіраў усіх католікаў, з якімі вучыўся ў Свіслачы, і нападаў на пастарункі паліцыі. Яны пабіліся ў Беластоку. Але там іх разагналі, і яны прыйшлі ў Ялоўку. У Ялоўцы зайшлі да ксяндза, ксёндз іх паблагаславіў і яны пайшлі на Баранавічы або дзесьці ў той бок. Ну і што было далей? Той Каліноўскі круціўсо, круціўсо аж дакруціўсо, што павесілі!

— А што з тым Вінцэнтым? — спытала я.

— А хто яго ведае! — пачулася ў адказ.

Чамусь у час, калі ішоў аповед пра заслугі ялоўскага ксяндза ў справе Каліноўскага, мне прыгадаўся кадр з нядаўняй сустрэчы на плябаніі ў Ялоўцы. Там не хацелі ні ведаць, ні слухаць пра нейкага Каліноўскага. Наадварот, здавалася, што Вінцэнты Канстанціна, як закаранелага беларуса, там яшчэ мацней выпіхалі „за рэчку".

Каліноўскіх было двух братоў: адзін Кастусь а другі Вінцэнты

Калі я пазваніла ў Міхалоўскі дом культуры і спытала пра месцы звязваныя з Каліноўскім, там — а як жа — адразу адаслалі ў Гарадок.

— U nas to nie ma co szukać, — пачула я ў адказ.

* * *

— Мы купілі палац і зямлю пасля бежанства, — кажа Міхал Арцёмчык, гаспадар, якія жыве на месцы, дзе стаяў двор. Пра мінулае месца напамінае архітэктура краявіду. Месца, быццам старажытнае гарадзішча, высіцца сярод даліны Свіслачы. Калі ходзіш па панадворку, адчуваецца згустак энергіі. Тут таксама захаваліся фрагменты старога парку з каштанамі. Сёння гістарычны панадворак уяўляе сабой звычайны сялянскі хутар.

— Будынкі мы паставілі самі, — кажа пра сучасную забудову спадар Арцёмчык, — дзеля гэтага бацькі скарысталі матэрыял са старога двара, які пасля 1920 года з-за задоўжанасці пайшоў пад ліцытацыю.

Спадар Міхал прывык да наведвальнікаў з Беларусі і Польшчы:

— Калі хочаце ставіць тут помнік ці камень, — кажа мне, — то сабе стаўце, я не супраць.

Мемарыяльная табліца на польскай і беларускай мовах, якая раней аздабляла школьны будынак у Мастаўлянах, знаходзіцца зараз на тэрыторыі Міхалоўскай гміны. Крацей, яна ляжыць у „Літаратунай кавярні на Канцы свету", у Цісоўцы, — так празывае сваю вясковую хатку рэдактар беластоцкага часопіса „Карткі" Багдан Дудко.

— Я зняў гэтую дошку з будынка, бо баяўся, што яна абарвецца і прападзе ў крапіве, — сказаў.

Бач. Нарабіў варожай работы. У Мастаўлянах думаюць, што табліцу ўкралі католікі з недалёкага хутара. Спецыяльна, на злосць праваслаўным.

Ганна Запартыка і Вячаслаў Швед ля хаты Міхала Арцёмчыка

— А што ты! — адмахваецца рукамі і нагамі мой субяседнік. — То ж я зняў з добрымі намерамі, з сябрамі-праваслаўнымі. А цяпер, калі трэба, аддам яе ў добрыя рукі.

31.10 — 06.11

(22.03. — 20.04.) Першыя дні лістапада — пачатак прыгожай любоўнай прыгоды. 1-4.11. можа згубіць цябе твой востры язык і бяздумнае крытыканства. Хоць будзе нялёгка, закончыш фінансавыя клопаты і выйдзеш на простую дарогу.

(21.04. — 21.05.) Будзеш здольны да ахвярнасці і аддання, а блізкія ахвотна гэта выкарыстаюць. Трэба аформіць шмат неадкладных спраў; многа бегатні. Інтэлігентнасцю і спрытам схіліш да сябе важных людзей.

(22.05. — 22.06.) Пакуль скажаш штосьці прыкрае, два разы гэта перадумай. Вострым языком наробіш сабе бяды. На працы будзеш узорам пільнасці і сумленнасці. Твае вітальныя сілы папраўляюцца з кожным днём.

(23.06. — 23.07.) Будзеш памяркоўны, спакойны і апанаваны. І прыцягнеш да сябе фартуну! Выдатна ў фінансах і міжлюдскіх кантактах. Прачнецца і твая творчая моц!

(24.07. — 23.08.) Набярэш цяпер вялікага імпэту. Ахвота да дзеяння і змагання з выклікамі. Ды трапіць можаш на перашкоды. Але твая прафесійная пазіцыя выкліча зайздрасць. Пераканаешся, што моцны дух мае ўплыў на цела.

(24.08. — 23.09.) Адчуеш у сабе вялікую энергію, ды паявіцца праблема, куды яе накіраваць. Не паддасіся ніякай хваробе, справішся нават са звычайнай прастудай. Поўня Месяца 2.11. наставіць цябе рэфлексійна. Цэлую першую палову месяца ты дома — як госць.

(24.09. — 23.10.) 1-5.11. будзеш вельмі прыгожы і спакуслівы. Дасканалы настрой, шчаслівыя выпадкі, поспехі ў найважнейшых для цябе справах. На працы віражы ўжо за табою. Не рассейвайся на драбязу, не лаві сарака сарок за хвост.

(24.10. — 22.11.) У тваім знаку сустракаюцца чатыры планеты! Да ажыўляльнага Сонца, зіхотнага Меркурыя, шчодрай Цэрэс далучыць Венера. Зробіш уражанне на асобе, якая пакуль не паддалася тваёй красе. Маеш галаву да інтарэсаў і справішся з выклікамі. Вучыся на старых памылках.

(23.11. — 22.12.) У першай палове месяца не ўсё пойдзе па тваіх планах. У прафесійным жыцці мноства сюрпрызаў; больш мілых. Не абяцай зашмат па новым знаёмстве.

(23.12. — 20.01.) На гарызонце змены, якіх ты даўно спадзяешся. Не паддасіся працяўнасцям лёсу. Рашэнне: ці ратаваць сувязь, ці расстацца. Духовая дарога: умела аддзяліць важныя рэчы ад тых без значэння. Пільнуй здароўя, звяртай увагу нават на невялікія сігналы.

(21.01. — 19.02.) Дынамічны перыяд. Рост і прагрэс у прафесійным жыцці. Спрыяе табе шчасце, да таго ты сарганізаваны, дзейнічаеш абдумана. Схопіш вецер у ветразі, перашкоды абмінеш. У пары — калі твой партнёр не захоўвае прынцыпаў, пара яго кінуць!

(20.02. — 21.03.) Будзеш спакойны, памяркоўны. Лёгка ўтрымаеш парадак. Пашчасціцца табе ў інтарэсах і прафесійных справах. Ды за каханай асобай сакрэтны догляд не зашкодзіць. Магчымыя паразы трактуй як урок і досвед.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960